ЛІДАР «ЧЫСТАГА ГОЛАСУ» ПРА ШЛЮБ

Сямейная

НЮАНСЫ МЕЗАЛЬЯНСУ

Сямейная

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 ЛІПЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 146 (29260)

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:

«Яшчэ з сакавіка бягучага года прафсаюзы праводзяць маніторынг сацыяльна-эканамічнай сітуацыі на прадпрыемствах усіх галін эканомікі. Штотыдзень мы аналізуем пытанні, якія датычацца занятасці работнікаў, тэрмінаў выплаты заработнай платы, забеспячэння дадатковых сацыяльных гарантый у адпаведнасці з калектыўнымі дагаворамі. І ў цэлым мы бачым, што гэты няпросты перыяд мы пераадольваем з мінімальнымі стратамі. На прадпрыемствах і ў арганізацыях не было выпадкаў масавага звальнення. Захаваны працоўныя калектывы і вытворчасці».

КАРАТКА

- **Больш за 20 новых спецыяльнасцяў адкрылі сёлета ВНУ.**
- У Беларусі ўводзяцца дзве новыя тарыфныя групы спажыўцоў электраэнергіі.
- **Сацыяльныя пенсіі, даплаты і надбаўкі пенсіянерам вырастуць з 1 жніўня.**
- Прафсаюзы выпрацавалі дадатковыя меры па падтрымцы прадпрыемстваў у перыяд аднаўлення эканомікі.
- **З-за аварыі арганізаваны падвоз пітной вады жыхарам некаторых мікрараёнаў сталіцы.**
- Дзіцячыя дапамогі павышаюцца з 1 жніўня.
- **Абноўлены пасля рэканструкцыі пуцеправод адкрылі ў Баранавічах.**
- Паслугамі аўтакрам у Беларусі карыстаюцца жыхары 15 тысяч вёсак.

ISSN 1990 - 763X

З новым садам!

Фота БелТА.

Павел МАРЧУК з дзецьмі Ільёй і Эміліяй — выхаванцамі-навасёламі.

Новы дзіцячы садок на 230 месцаў адкрыўся ўчора ў Калодзішчах. У садзе будуць укамплектаваныя 12 груп па ўзросце: пяць з іх змогуць наведваць дзеці ад 3 да 4 гадоў, чатыры — ад 4 да 5 гадоў, тры — ад 5 да 6 гадоў.

Прыёмная кампанія — 2020

Юрый МІКСЮК:

«Ад закрытых заданняў мы адмовіцца не можам»

338 стабальных вынікаў было зарэгістравана на цэнтралізаваным тэсціраванні ў гэтым годзе. Усяго дасканалымі сертыфікатамі могуць пахваліцца 323 удзельнікі ЦТ, а 15 абітурыентаў атрымалі такіх адразу два.

СТАР. 3



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Цікавы вопыт

РАТУЮЧЫ ЖЫЦЦЁ

Лагойск стаў першым у Беларусі горадам без абортаў

У 2018-2019 гадах у Лагойскім раёне нарадзілася больш за 550 дзяцей. Для рэгіёна, дзе жыве каля 36 тысяч насельніцтва, траціна з якіх пенсіянеры, гэта добры паказчык. Ужо пяць гадоў па ініцыятыве акушэра-гінеколага цэнтральнай раённай бальніцы Ірыны КАЗЛОЎСКАЙ тут дзейнічае праграма «Лагойск — горад без абортаў». Карэспандэнт «Звязды» накіравалася ў ЦРБ, каб на свае вочы ўбачыць, як пастаўлена работа ў горадзе, дзе ўрачы першыя ў краіне адмовіліся ад штучнага перарывання цяжарнасці.

— У 2014 годзе нашы акушэры-гінеколагі асэнсавана адмовіліся ад штучнага перарывання цяжарнасці па жаданні жанчын. Гэтаму паспрыялі змены ў закон аб ахове здароўя, у прыватнасці, яго 27-ы артыкул, які дазваляе ўрачам не рабіць аборт, калі адсутнічаюць медыцынскія або сацыяльныя паказанні. Калі яны прысутнічаюць, гэтыя маніпуляцыі праводзяцца. Але такіх выпадкаў няшмат — у сярэднім ад аднаго да трох у год, — кажа **намеснік галоўнага ўрача цэнтральнай раённай бальніцы Васіль КАЗЛОЎСКІ.** — Калі ж пацыентка, у якой нармальна працякае цяжарнасць, стаіць на сваім, то ў першую чаргу з ёй размаўляюць урачы агульнай практыкі, гінеколагі, стараюцца разабрацца ў прычынах яе рашэння пазбавіцца ад плода. Часта гэта бывае імпульсіўны крок. Затым пацыентку накіроўваюць па кансультацыю да псіхолага, мэта якога не ў тым, каб адгаварыць ад аборту, а ў тым, каб жанчына сама прыняла асэнсаванае і адказнае рашэнне. І калі яна зразумее абсурднасць сітуацыі, то можа і адмовіцца ад сваіх намераў. Як сведчыць статыстыка, так робіць траціна будучых маці.

СТАР. 13

Даследаванні

НА НАЛЕЖНЫМ УЗРОЎНІ

Аналітыкі вывучылі грамадскую думку адносна даверу кандыдатам у прэзідэнты

Аналітычны цэнтр Ecoom па замове ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» правёў сацыялагічнае апытанне аб электаральных настроях і перавагах грамадзян. Даследаванне праводзілася з 23 да 27 ліпеня метадам тэлефоннага апытання. Рэспубліканская выбарка складае 1879 рэспандэнтаў, статыстычная хібнасць не перавышае 2,5—4 %.

Паводле атрыманых падчас апытання звестак, удзел у галасаванні плануюць узяць сумарна 89,5 % насельніцтва (па выніках папярэдняга замеру 10-13 ліпеня было 87,3 %). Пры гэтым да магчымасці датэрміновага галасавання ў цэлым станоўча ставіцца больш чым палова насельніцтва — 61,4 %.

На перыяд правядзення апытання электаральныя перавагі грамадзян у дачыненні да кандыдатаў у прэзідэнты размеркаваліся наступным чынам: Аляксандра Лукашэнку гатовыя падтрымаць 72,3 % беларусаў, рэйтынгі астатніх не перавышаюць сумарна 10 %. Не змаглі адказаць 10,9 %, не захацелі адказваць 3,1 %, супраць усіх — 3,7 %.

Пры гэтым узровень даверу да дзеючага Прэзідэнта, які ўключае не толькі электаральны рэйтынг, але і ацэнку сацыяльна-эканамічнай палітыкі кіраўніка дзяржавы, эфектыўнасці рашэнняў, якія ім прымаюцца, складае 78,1 %.

У параўнанні з папярэднім замерам, які праводзіўся аналітычным цэнтрам Ecoom 10-13 ліпеня, зафіксаваныя пэўныя змены ў электаральных перавагах грамадзян, звязаныя з тым, што Віктар Бабарыка і Валерый Цапкала выбылі з прэзідэнцкай гонкі, а частка іх электарату перайшла ў лагер Святланы Ціханоўскай. Ускосным стымулам выступіла стварэнне так званага аб'яднанага штаба згаданых прэтэндэнтаў. У той жа час колькасць тых, хто не вызначыўся, засталася фактычна нязменнай (увогуле 12,6 %), што дазваляе меркаваць пра наяўнасць пэўнай інтрыгі адносна далейшай дынамікі рэйтынга кандыдатаў.

З крыніц інфармацыі аб ходзе выбарчай кампаніі найбольшы давер у насельніцтва пры шматварыянтнасці адказаў выклікаюць тэлебачанне (65,4 %), інтэрнэт-СМІ (43,2 %), а таксама непасрэднае сацыяльнае асяроддзе (сябры, знаёмыя, сваякі — у цэлым па краіне 25,7 %). Пры гэтым моладзь (асобы ад 18 да 29 гадоў) у найбольшай ступені давярае інфармацыі з інтэрнэт-СМІ (62,2 %), тэлебачання (25,8 %), а таксама ад сацыяльнага асяроддзя (28,5 %).

Агульны сацыяльны фон электаральнай кампаніі характарызуецца перавагай у грамадстве аптымістычных настрояў (62,8 %). У той жа час занепакоенасць і няўпэўненасць у будучыні выказваюць 17,2 %. Абыякавасць адчуваюць 5,5 %.

Паводле БелТА.



Меркаванне

«ЖЫЦЬ, КАБ... НЕ БУРЫЦЬ!»

Святлана РУМЯНЦАВА, настаўнік беларускай мовы і літаратуры СШ № 15 Наваполацка, пераможніца рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года — 2017»:

— Для развіцця сярэдняй адукацыі за апошнія гады ў краіне зроблена многае. Узводзяцца новыя школы, навучэнцам 8-9 класаў дадзена магчымасць вывучэння асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні. Абнаўляюцца і ўстановы адукацыі, з кожным годам яны становяцца лепш тэхнічна абсталяваныя, развіваецца інфармацыйная прастора. Толькі ў нашу ўстанову адукацыі было накіравана чатыры мультыборды, сучасныя камп'ютары для кабінета інфарматыкі і іншыя прылады.

Прыемна адзначыць, што ў краіне рэалізуецца адзіная адукацыйная палітыка, прымаецца сістэма мер па павышэнні статусу настаўніка, якая ўключае маральнае і матэрыяльнае стымуляванне працы, памяншэнне колькасці дадатковых абавязкаў як школы ў цэлым, так і настаўніка ў прыватнасці. Праблемныя ж бакі і недахопы былі і будуць у любой сферы, але варта разумець усім нам: калі мы не толькі будзем выказваць сваю незадаволенасць, а пастараемся разам вырашаць праблемныя моманты, то дасягнём вельмі многага.

А да вулічнага пратэсту як формы вырашэння найважнейшых палітычных пытанняў стаўлюся негатыўна. Агрэсіўныя паводзіны ніяк нельга назваць канструктыўнымі. Такім чынам недапушчальна вырашаць канфлікты. Для кожнага з нас важна трымаць любыя свае эмоцыі пад кантролем, у тым ліку і агрэсію.

Сваім вучням заўсёды даводжу, што трэба не на свае прыродныя інстынкты спадзявацца, а на інтэлектуальнае развіццё, якое заўсёды любога чалавека рухала наперад і дазваляла дабівацца вынікаў. Вам штосьці не падабаецца? Што ж, гэта здараецца ў нашым жыцці, і вас можна зразумець. Але не трэба вырашаць усе свае праблемы пры дапамозе грубай сілы, бо гэта вельмі небяспечная і непрадуманая ў большасці выпадкаў ідэя. Лепш абдумваць свае дзеянні, аналізаваць учынкі і накіраваць сваю агрэсіўнасць на вырашэнне праблем мірным шляхам. Маладому пакаленню варта памятаць словы Анатоля Вярцінскага:

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць,
Не марнаваць, не нішчыць,
не бурыць —
Тварыць!

Гісторык, даследчык віцебскай даўніны А. П. Сапуноў пакінуў нам адказ на пытанне, якое не можа не хваляваць кожнага з нас: «Што ж у будучым чакае Беларусь і беларуса? А гэта ўжо ў значнай ступені ў нашых руках і залежыць ад нашых сумленных адносін да нашага абавязку перад дарагой Радзімай. Калі мы зможам выканаць наш абавязак добрасумленна, то будучыня наша светлая і радасная...»

Бяспека

Былі затрыманы. Праводзіцца праверка

Учора ўначы супрацоўнікі праваахоўных органаў Беларусі пад Мінскам затрымалі 32 баевікоў замежнай прыватнай ваеннай кампаніі Вагнера. Акрамя таго, яшчэ адзін чалавек быў знойдзены і затрыманы на поўдні краіны, паведамляе БелТА.

Як расказалі ў праваахоўных органах, была атрымана інфармацыя аб прыбыцці на нашу тэрыторыю больш чым 200 баевікоў для дэстабілізацыі абстаноўкі ў перыяд выбарчай кампаніі. Пры сабе расіяне мелі кожны па невялікай ручной паклажы і на ўсіх — тры вялікія цяжкія чамаданы, загрузку якіх у транспартны сродак ажыццяўлялі некалькі мужчын.

Па прыбыцці ў сталіцу ў ноч з 24 на 25 ліпеня група засялілася ў адну з гасцініц Мінска і павінна была выселіцца 25 ліпеня, аднак пакінула гатэль 27 ліпеня і пераехала ў адзін з санаторыяў Мінскага раёна.

Па звестках адміністрацыі санаторыя, прыезджыя звярнулі на сябе ўвагу не характэрнымі для расійскіх турыстаў паводзінамі і аднастайным адзеннем у стылі мілітары. Спіртнога не ўжывалі, забаўляльных устаноў не наведвалі, трымаліся адасоблена, імкнучыся не прыцягваць да сябе ўвагі. Яны невялікімі групамі ўважліва вывучылі тэрыторыю і асяроддзе санаторыя. Учора ноччу 32 чалавекі сіламі групы «А» КДБ пры падтрымцы АМАП ГУУС Мінгарвыканкама былі затрыманы. Акрамя таго, яшчэ адзін чалавек быў знойдзены і затрыманы на поўдні краіны. У дачыненні да згаданых асоб Следчым камітэтам праводзіцца праверка.

* * *

Напрыканцы працоўнага дня Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сабраў тэрміновую нараду з членамі Савета бяспекі па сітуацыі з затрыманнем баевікоў замежнай ПВК, дадала БелТА.

«Я запрасіў вас для таго, каб разабрацца з гэтым, можна сказаць, надзвычайным здарэннем, якое адбылося сёння ноччу. Інакш яго не назавеш», — адзначыў беларускі лідар.

Ён папрасіў старшыню КДБ Валерыя Вакульчыка больш дэталёва далажыць аб сітуацыі. «Я гляджу на рэакцыю расіян. Яны ўжо, апраўдваючыся, кажуць, што ледзь не мы іх самі сюды завезлі. Ясна, трэба ж неяк апраўдаць свае брудныя намеры. Таму вельмі прасіў бы, каб у гэтай сітуацыі і з гэтым фактам было ўсё вельмі адкрыта і сумленна. Калі гэта расійскія грамадзяне (а я так разумею, іх дапыталі), значыць, трэба звярнуцца неадкладна ў адпаведныя структуры Расійскай Федэрацыі, каб яны растлумачылі, што адбываецца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асобнае даручэнне Прэзідэнт таксама даў прэс-сакратару Наталлі Эйсмант: «Нам трэба звярнуцца да расійскіх сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку Telegram-каналаў, каб яны, як Пуцін кажа, «пургу не гналі». Калі вінаватыя, трэба з гэтай сітуацыі выходзіць годна. Не вінаватыя — добра, у нас няма ніякіх мэт зганьбаваць блізкую нам краіну».

«Таму я хацеў бы, каб коратка далажылі мне аб сітуацыі і аб тым, што на сённяшні дзень мы маем», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Блізкая ўлада

ЗВАНІЦЕ Ў ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ЖНІЎНЯ

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 1 жніўня, з 9:00 да 12:00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

* намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

«Ад закрытых заданняў мы адмовіцца не можам»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як зазначыў на сустрэчы з журналістамі **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК,** цэнтралізаванае тэсціраванне праходзіла сёлета ў няпростых умовах пандэміі COVID-19. І хоць рэгістрацыя на праходжанне тэстаў распачалася як звычайна — 2 мая, але хутка давялося пераносіць тэрміны правядзення ЦТ, змяняць графік і раздзяляць патокі абітурыентаў па самых масавых дысцыплінах — рускай мове і матэматыцы.

Новаўвядзенні закранулі таксама тэхнічныя аспекты падачы дакументаў і здачы ўступных іспытаў. Так, усе абітурыенты перад наведваннем пунктаў рэгістрацыі на ЦТ праходзілі папярэднюю анлайн-рэгістрацыю і запаўнялі заяву ў электронным выглядзе, атрымлівалі асабісты рахунак, на які пералічвалі плату за прыём і афармленне дакументаў. Затым у парадку электроннай чаргі яны наведвалі пункты рэгістрацыі ў прызначаны для іх дзень і час. Галоўнай мэтай было скараціць час знаходжання абітурыентаў у памяшканнях пункта рэгістрацыі і зменшыць колькасць людзей, якія там адначасова знаходзяцца. Замест абітурыента пропуск дазвалялася атрымаць яго прадстаўніку. Натарыяльна заверэная даверанасць для гэтага не патрабавалася.

— Мы рабілі ўсё, каб стварыць максімальна камфортныя і бяспечныя ўмовы для маладых людзей, — дадаў Юрый Міксюк. — Падчас правядзення ЦТ было забяспечана надзейнае сацыяльнае дыстанцыраванне, абітурыентаў размяшчалі на адлегласці не менш за метр. Максімальная колькасць абітурыентаў у адной аўдыторыі не перавышала 50 чалавек. Усё гэта запатрабавала задзейнічаць дадатковы аўдыторны фонд і прыцягнуць значна большую колькасць арганізатараў, якія павінны былі прысутнічаць у кожнай экзаменацыйнай аўдыторыі.

Сваім правам здаваць чатыры тэсты замест трох скарысталіся 48 працэнтаў ад агульнай колькасці тых, хто прайшоў рэгістрацыю. Дзве дзяржаўныя мовы (беларускую і рускую) здавалі 13 працэнтаў удзельнікаў ЦТ.

Усяго ў цэнтралізаваным тэсціраванні ўзялі ўдзел 62 384 абітурыенты. Каля 3 % тых, хто рэгістраваўся, не з'явіліся на экзамен. Калі казаць пра выяўленыя парушэнні падчас ЦТ, то сёлета іх было менш — 13 выпадкаў (у 2019 годзе — 17). Пераважна парушальнікаў выдалялі з экзаменацыйных аўдыторый за мабільныя тэлефоны, якія трэба было здаць для захоўвання арганізатарам яшчэ на ўваходзе. Але былі таксама выпадкі выкарыстання шпаргалак і іншыя парушэнні парадку правядзення ЦТ.

У рэзервовыя дні тэсты здавалі 1043 абітурыенты (у 2019 годзе — 927). У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў чакалі, што іх будзе больш. Дарэчы, сёлета ўпершыню для здачы ЦТ у рэзервовы дзень не трэба было ехаць у Мінск — гэта можна было зрабіць і ў абласных цэнтрах.

Сярод удзельнікаў ЦТ у рэзервовыя дні абсалютных вынікаў зафіксавана не было, хоць сустракаліся і дастаткова высокія балы.

Найбольшая колькасць стабальных вынікаў зарэгістравана сёлета на ЦТ па беларускай мове — 78. На ЦТ па рускай мове іх было 27, па матэматыцы — 30, грамадазнаўстве — 44, біялогіі — 55, замежных мовах — 47, хіміі — 29, фізіцы — 3, гісторыі Беларусі — 19, Сусветнай гісторыі найноўшага часу — 6.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

А ў 134 выпадках абітурыенты ўмудрыліся атрымаць нуль балаў нават па новай сістэме падліку балаў, якая па-ранейшаму выклікае шмат пытанняў. Журналісты пацікавіліся ў Юрыя Міксюка сярэднімі балами на ЦТ па розных прадметах, але дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў адмовіўся агучваць лічбы, якія ўсіх цікавяць, бо лічыць, што «гэтая велічыня не нясе ніякай карыснай інфармацыі».

— Сярэдні бал, як і па ўсіх методыках у свеце, будзе ў межах 50, — растлумачыў ён. — Калі абітурыентаў насамрэч цікавіць гэта пытанне, яны могуць паглядзець апублікаваныя сярэднія балы за мінулы год: адхіленне будзе плюс-мінус адзін-два балы. Выключэнне складае толькі іспанская мова, дзе сярэдні бал знізіўся на пяць пунктаў. Абітурыенту трэба ведаць толькі сваю суму балаў і прахадныя балы на спецыяльнасці, куды ён збіраецца паступаць.

Паколькі ЦТ па рускай мове праходзіла сёлета не адзін, а два дні, у абітурыентаў склалася ўражанне, што тыя, хто здаваў тэст па рускай мове ў другі дзень, апынуліся ў больш выйгрышным становішчы, таму што сутнасць прапанаваных ім заданняў была ідэнтычная тым, якія абітурыенты здавалі ў першы дзень. Пасля заканчэння ЦТ «першапраходцы» падзяліліся з сябрамі іх зместам, і тым было прасцей сарыентавацца і падрыхтавацца да тэста. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў з такой пастаноўкай пытання катэгарычна нязгодныя.

— Наша задачай было стварыць для абітурыентаў роўныя ўмовы і, нягледзячы на нестандартную сітуацыю, не змяняць правілы гульні. Калі паглядзець на тэсты па рускай мове за многія гады, то можна пераканацца, што заданні ў іх гучаць аднолькава, тое ж самае і з варыянтамі, што прапануюцца на рэпетыцыйным тэсціраванні. Але напаўненне ў іх рознае, — кажа Юрый Міксюк. — Кожнае заданне правярае да дзесяці правіл. Таму магчымасць варыятыўнасці напаўнення кожнага з іх канкрэтыкай вельмі вялікая. Дарэчы, усім было цікава параўнаць вынікі ўдзельнікаў ЦТ па рускай мове ў першы і ў другі дзень. Калі ў першы ў нас было 23 абсалютныя вынікі па гэтым прадмеце, дык у другі 100 балаў набралі толькі чатыры абітурыенты. Калі казаць пра сярэднія паказчыкі, то ў абітурыентаў, што здавалі тэст у першы дзень, яны аказаліся вышэйшыя.

Крытыку наконт магчымасці ўгадвання правільных адказаў арганізатары ЦТ лічаць не зусім аб'ектыўнай, хоць і пагаджаюцца, што такая імавернасць усё яшчэ захоўваецца.

— Мы праводзім пэўную работу, каб зменшыць такую магчымасць, — каментуе Юрый Міксюк. — Так, у частцы А, дзе прапануюцца заданні закрытага тыпу з варыянтамі адказаў, павялічылі колькасць дыстрактараў з чатырох да пяці па шэрагу прадметаў. Але адмовіцца цалкам ад закрытых заданняў мы не можам: яны ўжываюцца ў многіх краінах свету і даюць магчымасць за кароткі час праверыць веды абітурыента па шырокім коле пытанняў і тэм. Але набраць вялікую колькасць балаў за такія заданні немагчыма.

Абітурыентам нагадалі, што 31 ліпеня заканчваецца падача дакументаў у ВНУ на бюджэтную форму навучання, а таксама падача дакументаў у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на бюджэт на базе дзевяці класаў. Графік прыёму дакументаў пабудаваны такім чынам, каб у абітурыентаў, якія не паступяць у ВНУ, была магчымасць паспець падаць свае дакументы ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Прыём дакументаў на базе 11 класаў у ССНУ вядзецца да 12 жніўня на бюджэтную форму навучання і да 18 жніўня — на платную форму.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Парламент Турцыі прыняў законапраект аб узмацненні кантролю за сацсеткамі

Вялікі нацыянальны сход Турцыі прыняў законапраект аб узмацненні кантролю за замежнымі сацыяльнымі сеткамі. Пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на тэлеканал NTV. Паводле яго звестак, гэтае рашэнне абавяжа замежныя кампаніі, у прыватнасці Facebook, Twitter, Instagram, адкрыць свае прадстаўніцтвы ў Турцыі. Такія юрыдычныя асобы будуць несці адказнасць за публікацыю на іх платформах супрацьпраўнага кантэнту. Яны таксама будуць абавязаны прымаць меры для спынення распаўсюджвання падобнай інфармацыі. Калі кампаніі адмовяцца адкрываць турэцкія прадстаўніцтвы, то Анкара мае намер абмяжоўваць доступ да сацыяльных сетак аж да поўнага закрыцця доступу да іх у Турцыі.

Ініцыятарамі гэтага законапраекта выступілі кіруючая Партыя справядлівасці і развіцця і Партыя нацыяналістычнага руху. Крытыка з боку турэцкай эліты абрынулася на замежныя сацсеткі ў канцы чэрвеня пасля таго, як міністр фінансаў і казначэйства Турцыі Берат Албайрак, які таксама з'яўляецца зяцем прэзідэнта Таіпа Эрдагана, апублікаваў у Twitter паведамленне аб нараджэнні чацвёртага дзіцяці. Акрамя станоўчых, ён атрымаў масу негатыўных каментарыяў.

У аўтамабілях расійскай вытворчасці могуць з'явіцца алказамкі

Расійскі Мінпрамгандаль, як паведамляе «КоммерсантЪ», да канца года плануе распрацаваць «канцэпцыю ўкаранення ў масавае спажыванне» алказамкоў (яны блакіруюць запальванне пры выяўленні алкаголю ў выдыху) і «прастымулюе» аўтавытворцаў ўстанаўліваць гэтыя прыборы ў машыны, якія сыходзяць з канвеера. Раней установу прыбораў падтрымлівала дарожная міліцыя, да таго ж з 2022 года ўсе транспартныя сродкі, выраблены на тэрыторыі Еўрасаюза, павінны быць абсталяваны такімі замкамі. Эксперты паказваюць, што ініцыятыва непазбежна прывядзе да росту кошту аўтамабіляў, паколькі цэны на алказамкі складаюць ад 25 да 120 тысяч расійскіх рублёў. Да таго ж, папярэджваюць апаненты, вялікая імавернасць памылковага спрацоўвання сістэмы блакіравання. «Пакуль усё гэта выглядае як беспілотнікі і лятаючыя таксі. Калі-небудзь мы да гэтага прыйдзем, але пакуль забягаем наперад, — прыводзіць выданне словы дэпутата Дзярждумы Вячаслава Лысакова. — Чаму кіроўца, які наогул не п'е, павінен плаціць за алказамок?»

У Францыі пачалі будаваць «штучнае сонца»

У даследчым цэнтры Кадараш на поўдні Францыі, за 65 кіламетраў ад Марселя, пачалося будаўніцтва першага ў свеце эксперыментальнага тэрмаядзернага рэактара ІТЭР. Цырымонію адкрыў прэзідэнт Эмануэль Макрон — пад музыку з кінасагі «Зорныя войны», паведамляе ВВС.

Вучоныя называюць ІТЭР штучным сонцам. У вакуумнай камеры памерам з 10-павярховы дом — 30 метраў у вышыню і столькі ж у дыяметры — плануецца ў прамысловым маштабе аднавіць працэс тэрмаядзернага сінтэзу, які сілкуе энергіяй нашу зорку.

Сама ідэя тэрмаядзернага рэактара, якую цяпер спрабуюць рэалізаваць без перабольшання ўсім светам — у праекце ўдзельнічаюць 35 краін, — належыць яшчэ савецкім навукоўцам з Інстытута атамнай энергіі імя Курчатава.

У тэорыі тэрмаядзерны сінтэз — невычэрпная крыніца энергіі. Усяго некалькіх грамаў вадароднага паліва дастаткова, каб забяспечыць цяплом і электрычнасцю тысячы дамоў, а брыкет памерам з ананас можа замяніць 10 тысяч тон вугалю.

У адрозненне ад традыцыйных цеплавых або атамных электрастанцый, тэрмаядзерны рэактар не забруджвае атмасферу выкідамі парніковых газаў і не пакідае таксічных радыеактыўных адходаў.

Запрашальнік

«Покліч Палесся» пачуем у жніўні

Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» пройдзе 15 жніўня 2020 года. Прыхільнікі свята сустрэнуцца ў нацыянальным парку «Прыпяцкі», у аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна. Галоўнай пляцоўкай для правядзення мерапрыемства стане гісторыка-этнаграфічны комплекс «Музей пад адкрытым небам».

www.petrikov.by

Традыцыйна фестываль ужо больш за дзесяць гадоў збірае ўдзельнікаў і гасцей кожныя два гады, каб паказаць усю палітру нацыянальных культур. Галоўнымі мэтамі гэтага культурнага свята з'яўляюцца захаванне і папулярызацыя этнакультурных традыцый Палесся, вывучэнне і падтрымка гісторыка-культурнай спадчыны Палескага рэгіёна, а таксама ўмацаванне творчых сувязяў жыхароў Беларусі, Расіі, Украіны і стварэнне спрыяльных умоў для развіцця культурна-гістарычнага і экалагічнага турызму. Арганізоўваецца фэст Гомельскім і Брэсцкім аблвыканкамамі, Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнай прыродаахоўнай установай «Нацыянальны парк «Прыпяцкі» і іншымі. Сёлета свята нацыянальных культур пройдзе шосты раз. Плануецца, што ў ім возьмуць удзел творчыя калектывы, майстры і рамеснікі з розных раёнаў Брэсцкай і Гомельскай абласцей.

Візітоўкай фестывалю з'яўляецца канцэрт фальклорных ансамбляў і народных калектываў. Як і раней, у гасцей фестывалю будзе магчымасць навучыцца новаму, пакаштаваць беларускія стравы і азнаёміцца з работамі народных майстроў, а магчыма, нават навучыцца нешта рабіць самім.

Па палічках

ДАПАМАГЧЫ. НЕЛЬГА ПАМЫЛІЦЦА

Мяжа адказнасці і новыя дзеянні натарыусаў

Сельвыканкамы пачнуць завяраць даверанасці на атрыманне пенсіі, але не змогуць натарыяльна іх засведчваць. Натарыяльная тайна будзе ахоўвацца законам, а натарыус — адказваць за недакладнасць у рабоце сваёй маёмасцю... Гэтыя і многія іншыя змены чакаюць беларусаў з 3 студзеня 2021 года, калі пачне дзейнічаць абноўлены закон «Аб натарыяце». Чым карысныя наваўвядзенні і ці спросцяць яны зносіны са спецыялістамі, карэспандэнту «Звязды» дапамагала разабрацца Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты.

Матэрыяльная шкода — кампенсуецца, маральная — не

Старшыня запэўніла, што ўсе змены ў закон дыктуюцца жыццёвай практыкай і нараджаюцца са зваротаў грамадзян. Натарыусы хочуць быць адказнымі і законапаслухмянымі, таму карэкціроўкі робяцца строга дзеля ўмацавання абароны інтарэсаў чалавека.

У новым законе з'явіцца, напрыклад, норма, якая дае падставу патрабаваць ад натарыуса кампенсацыю, калі ён сваім натарыяльным дзеяннем парушыў заканадаўства, выдаў натарыяльную тайну, згубіў дакументы ці пракансультаваў неналежным чынам. Калі падобныя дзеянні выклікалі шкоду маёмасці ці правоў кліента, натарыус адказвае за гэта ўсёй сваёй маёмасцю. У дзеючым жа законе адказнасць натарыуса прапісана досыць схематычна.

— Якасць натарыяльнага дзеяння можа сур'ёзна паўплываць на маёмасныя правы і інтарэсы чалавека. Калі натарыус падчас сведчання здзелкі парушыў закон, не вытрымаў інтарэсы трэціх асоб, што парушаюцца гэтым дзеяннем, або дапусціў нейкую прафесійную няздбайнасць, ён павінен несці адказнасць у памеры рэальнага ўрону. Страхаванне адказнасці натарыуса дапамагае і натарыусу, і чалавеку, інтарэсы якога ён парушыў, атрымаць выплаты ў памеры рэальнага ўрону, — падкрэсліла Наталля Барысенка. *— Пры гэтым абазначаны межы кампенсавання шкоды. Матэрыяльны ўрон можна спагнаць толькі пры наяўнасці судовага рашэння, дзе ўказаны прычыны шкоды і памеры кампенсацыі. Патрабаваць выплат за ўпушчаную выгаду ці маральны ўрон нельга.*

Павялічыцца таксама і тэрмін іскавай даўнасці па страхавым пакрыцці, які цяпер складае тры гады, а стане дзесяць. Сваю асабістую адказнасць страхуе, дарэчы, як сам натарыус, так і натарыяльная палата, якая можа давыплаціць чалавеку патрэбную суму, калі яе не хапіла ў натарыуса.

Напісанаму верыць, пакуль не даказана адваротнае

Навеламі ў законе стануць і дакладныя фармулёўкі асобных паняццяў. Так, упершыню абазначаны тэрмін «натарыяльная дзейнасць» — дзейнасць натарыусаў, ведамасных асоб сельвыканкамаў і замежных устаноў па здзяйсненні натарыяльных дзеянняў і аказанні паслуг прававога і тэхнічнага характару. А таксама тэрмін «натарыят» — прававы інстытут, закліканы выконваць ахову ўласнасці, маёмасных і ўласных немаёмасных правоў чалавека і сям'і.

— Вельмі важна, што да азначэння тэрміна натарыяльнай дзейнасці дадалі фармулёўку «аказанне паслуг прававога і тэхнічнага характару». Раней натарыусы толькі кансультавалі і хоць пры гэтым адказвалі за якасць гэтых дзеянняў, аднак яны не лічыліся натарыяльнай дзейнасцю і не ўключаліся ў комплекс паслуг натарыуса. Тым не менш кансультаванне і складанне праектаў здзелак — працэс, які сур'ёзна ўплывае на вынік натарыяльнага дзеяння, частка яго падрыхтоўкі.

Упершыню ў гісторыі натарыяту з'явіцца артыкул, у якім дзяржавай забяспечваюцца гарантыі натарыяльнай дзейнасці. Адна з такіх гарантый — немагчымасць канфіскацыі дакументаў без падстаў, акрэсленых заканадаўчым актам вышэйшага ўзроўню — дэкрэтам, указам ці кодэксам. Таксама — абавязак дзяржарганізацый падаваць па запыце натарыуса ўсе дакументы і звесткі, неабходныя для натарыяльнага дзеяння. Пры гэтым такія гарантыі даюцца не натарыусам, а людзям, якія карыстаюцца паслугамі спецыялістаў, падкрэсліла старшыня:

— Натарыят стане гэткім прафесійным пунктам доступу, дзе можна будзе атрымаць увесь комплекс паслуг ад збору дакументаў да праверкі фактаў і фарміравання праекта дагавора. Гэта дазволіць натарыусу валодаць абсалютна ўсёй інфармацыяй, што забяспечыць чысціню натарыяльнага дзеяння, каб пасля ніхто не мог умяшацца і паспрабаваць яго аспрэчыць. На выхадзе мы атрымаем якасны дакумент, які ўпершыню ў краіне названы натарыяльным актам.

Заканадаўча вызначана і азначэнне гэтага акта як законнага і дакладнага дакумента, што ўтрымлівае інфармацыю пра правы, абавязкі, юрыдычныя факты, якія з'яўляюцца праўдзівымі, пакуль судом не будзе даказана адваротнае. Такую законную сілу будзе мець, напрыклад, акт куплі-продажу аўто, калі толькі суд не дакажа, што прадавец быў судом прызнаны недзеяздольным у момант падпісання дакумента. Дарэчы, звесткі пра недзеяздольнасць асоб, прызнаных такімі судом, уносяцца ў рэгістр насельніцтва.

Тайна ахоўная і публічная

Натарыяльная тайна з 2021 года, з аднаго боку, будзе ўключана ў паняцце тайны, якая ахоўваецца законам нароўні з медыцынскай, банкаўскай і іншымі, а з іншага — з яе будуць выключаны звесткі аб даверанасцях. Старшыня БНП запэўніла, што супярэчнасцяў тут няма:

— Яшчэ ў 2015 годзе з паняцця натарыяльнай тайны ўжо была выведзена частка звестак аб спадчынных справах і фактах адмены даверанасцяў. Аднак да нас часта сталі звяртацца спецыялісты, якія намагаліся праверыць сапраўднасць даверанасці ўвогуле. І мы прыдумалі, як і не даць лішнюю інфармацыю трэцім асобам, і дапамагчы правяраць звесткі. Разбяром на прыкладзе. Я хачу купіць кватэру, якая належыць вам, але па даверанасці мне яе прадае іншы чалавек ад вашага імя. Вядома, я як пакупнік зацікаўлена, каб здзелка была чыстая, а я не пазбавілася сваіх грошай, таму хачу праверыць сапраўднасць даверанасці. І вось з наступнага года на нашым сайце мы дамо людзям магчымасць уводзіць у спецыяльнай графе звесткі пра даверанасць: імя і прозвішча ўладальніка кватэры, натарыуса, які засведчыў дакумент, дату яго выдачы, нумар даверанасці па рэестры. Інфармацыя адкрыецца толькі пры правільным уводзе ўсіх чатырох пазіцый. Такім чынам натарыяльная тайна будзе захавана і пацвярджэнне існавання дакумента прыадкрыецца толькі таму, хто сапраўды з ім мае справу.

Падобная магчымасць цяпер працуе і для спадчыннікаў, каб яны маглі праверыць, ці заведзена спадчынная справа. Для гэтага на сайце ўказваецца імя і дата смерці спадчынадаўца.

Засведчанне выхаду з ТАА і лічбавых копій

Новым законам прадугледжана, што ўсе натарыяльныя дзеянні павінны ўспрымацца на ўзроўні выключна заканадаўчых актаў. У выніку дзеянні натарыуса, якія цяпер не названыя ў законе, прапісалі ў яго новай рэдакцыі, што абазначыла іх як новыя. Напрыклад, будзе лічыцца натарыяльным дзеяннем пакрыццё расходаў, якія звязаны са смерцю чалавека, хоць гэта ў пэўных выпадках і цяпер робіцца. Такія сродкі выдаюцца, напрыклад, чалавеку, які даглядаў памерлага і значна патраціўся на гэта, пры гэтым сума не ўваходзіць у спадчынную маёмасць, сплачваецца да атрымання пасведчання аб праве на спадчыну, і не заўжды спадчыннік, акрэсліла старшыня БНП:

— Праўда, з'явіцца і два сапраўды новыя дзеянні. Натарыус будзе завяраць электронную копію дакумента, які першапачаткова быў створаны на паперы, і наадварот. А таксама засведчанне заявы аб выхадзе з таварыства з абмежаванай адказнасцю (ТАА) або з дадатковай. Цяпер патрабуецца сведчыць толькі сапраўднасць подпісу на дакуменце, а ўжо ў 2021-м будзем засведчваць дакумент, то-бок выяўляць волю чалавека, вывучаць, як яна адлюстравана ў заяве, правяраць дзеяздольнасць чалавека. Магчыма, будзем таксама накіроўваць гэты дакумент у Адзіны дзяржаўны рэестр юрыдычных асоб, каб гэта мела адпаведныя юрыдычныя наступствы. Здаралася, чалавек лічыў, што ён ужо некалькі гадоў як выйшаў з суполкі, а аказвалася, што яго імя заставалася ў рэестры як дзейснае, і ў выпадку банкрутства арганізацыі яму даводзілася сутыкацца з субсідзіярнай адказнасцю па даўгах.

Даверанасць на зарплату і пенсію

Натарыят шмат працуе ў межах сямейна-шлюбных адносін. Пэўныя змены закранулі і гэты аспект, у прыватнасці адносна кампетэнцый сельвыканкамаў, якія цяпер могуць натарыяльна засведчваць даверанасці, пагадненні і завяшчанні. Гэтае права мясцовыя органы ўлады нароўні з судамі набылі ў пачатку XX стагоддзя, калі ліквідавалі натарыяльныя канторы, расказала Наталля Барысенка:

— Калі натарыяльныя канторы пазней сталі аднаўляцца, натарыяльныя кампетэнцыі ў ведамасных асоб сельвыканкамаў, дзе кантор няма, засталіся. І гэтыя функцыі ім часткова і пакінуць. Аднак завяшчанне, напрыклад, як і даверанасць на распараджэнне маёмасцю, можна будзе засведчыць толькі ў натарыуса. Мы хочам аказваць сельскаму насельніцтву паслугі такой жа высокай якасці, як і гараджанам, і натарыусы ўжо шмат гадоў выязджаюць у аграгарадкі нават пры наяўнасці дзвюх-трох заявак ад людзей. І мы працягнем ездзіць. У Мінюсце ўжо гатовы праект пастановы, дзе ўказваецца, як гэта павінна рабіцца. Раз на квартал будзе складацца графік выезду пэўнага натарыуса ў канкрэтныя вёскі, а людзей будуць інфармаваць пра прыезд усімі магчымымі спосабамі. Пры гэтым абавязкова павінна быць хоць бы адна заяўка ад насельніцтва.

Натарыяльны тарыф на засведчанне завяшчання складае адну базавую велічыню (для інвалідаў і пенсіянераў гэтая паслуга, як і шмат іншых натарыяльных дзеянняў, каштуе палову базавай). Шмат ільгот існуе і ў межах афармлення спадчынных правоў па ступені сваяцтва. Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны ўвогуле вызвалены ад аплаты абсалютна ўсіх натарыяльных паслуг.

— Даверанасць на пенсію завяраецца бясплатна, а складанне праекта гэтага дакумента — 20 % ад базавай велічыні. Дарэчы, штогод прыкладна 20 % усіх натарыяльных дзеянняў натарыусы ажыццяўляюць бясплатна. З больш чым 1,4 мільёна дзеянняў адзін працэнт ільгатуецца натарыусамі па заяве людзей, якія не маюць права на зніжку, але не могуць заплаціць, — падзялілася старшыня БНП. — Літаральна днямі мы вызвалілі ад аплаты жанчыну з дачкой-інвалідам, якія атрымалі ў спадчыну ад памерлага мужа і бацькі грошы на ўкладзе.

Права завяраць даверанасці на атрыманне грашовых выплат, пенсій і дапамог застаецца ў кампетэнцыі сельвыканкамаў і ў 2021-м, аднак яны ўжо не будуць натарыяльна засведчваць гэтыя дакументы. Такую ж магчымасць маюць, дарэчы, і арганізацыі, дзе давярыцель працуе, вучыцца, жыве ці лечыцца.

Ірына СІДАРОК.

Будзь у курсе!

Міліцыянеры заступаюць на службу

У будынку сталічнай ратушы ўчора сабралася больш за 50 маладых міліцыянераў. Усе яны — сёлетнія выпускнікі Магілёўскага інстытута і Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў. Кіраўнік ГУУС Мінгарвыканкама Іван КУБРАКОЎ уручыў ім службовыя пасведчанні і табельную зброю. Так пачаўся першы рабочы дзень у лейтэнантаў міліцыі — адразу пасля ўрачыстай цырымоніі яны адправіліся на месцы службы.

Лейтэнант Юлія СУРАВЕЦ заступае на пасаду ўчастковага інспектара ў Першамайскім РУУС сталіцы. Яна скончыла Магілёўскі інстытут МУС. Бацька і дзед у Юліі — вайскоўцы. А гэта значыць, што пра асаблівасці службы ў сілавых структурах дзяўчына ведае з першых вуснаў.

— Кожны з нас прайшоў вялікі шлях, каб атрымаць афіцэрскія пагоны, — дзеліцца Юлія. — Што да мяне, то заўжды было жаданне працаваць з людзьмі. А служба ў міліцыі дае для гэтага выдатныя магчымасці. Практыка ў мяне была на месцы будучай службы, дзе і стала канчаткова зразумела, што гэта маё.

Звяртаючыся да выпускнікоў, Іван Кубракоў зазначыў, што мінская міліцыя — гэта флагман органаў унутраных спраў усёй краіны.

— Тут вельмі цяжка служыць, але ў той жа час вельмі ганарова. Людзі, якія прайшлі службу ў ГУУС Мінгарвыканкама, могуць працаваць у любым падраздзяленні краіны і будуць лічыцца там найлепшымі супрацоўнікамі. На іх кладзецца велізарная нагрузка. І вы гэта адчуеце, папрацаваўшы хоць паўгода.

Іван Кубракоў таксама дадаў, што заўжды сустракаецца з маладымі афіцэрамі.

— Яны ў любы час, папярэдзіўшы свайго кіраўніка (субардынацыю ў органах унутраных спраў ніхто не адмяняў), могуць прыйсці да начальніка ГУУС з нейкімі прапановамі або праблемамі. Гэтыя супрацоўнікі будуць праходзіць службу ў розных падраздзяленнях. Лейтэнантам, якія сёння сабраліся ў ратушы, трэба будзе абараняць нашых грамадзян ад злачынных замахаў. І я ўпэўнены, што яны ўсе да гэтага гатовыя.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

САПРАЎДНАЕ ЗАСТАЕЦЦА

Дачка прыехала з летніка, загартаваная лесам і камарамі, а разам з тым наскрозь «зараджаная» няўцямнымі рыфмамі і назольнымі рытмамі рускамоўнага рэпчыку ды папсы. Адразу пачала тэсціраваць дарослых на веданне слоў супер-мега-хітоў гэтага лета ад Клавы Кокі, Artik&Asti, Zivert і іншых, па нейкім непаразуменні яшчэ не лаўрэатаў прэміі Grammy ва ўсіх існуючых намінацыях. Як і чакалася, вынесла вердыкт «не ведаеце вы модных песень, а ваша музыка па радыё — лухта, во ў нас на дыскатэцы была нармальная!».

На маю думку, горшае, што тут можна было зрабіць, — уключыць на ўсю моц бацькоўскі аўтарытэт і альбо нівеліраваць яе цяперашнія захапленні, разбіраючы па костках пустэчу псеўдаглыбокіх фраз і банальнасць мелізмаў, альбо развязаць гарачыя спрэчкі, маўляў, тваёй Клаве, LittleBig і кампаніі да сапраўднай музыкі як да Месяца, сядзі ўжо тут, вялікі меламан... Таму я з сур'ёзным і ў меру захопленым тварам паслухала выбраныя куплет і прыпеў, і яшчэ раз, і яшчэ шмат, шмат разоў — пасля нагадала, што спрачацца аб густах справа для ўсіх бакоў загадзя пройгрышная і бессэнсоўная, і на тым тэму бацькоўскай адсталасці ад музычнай моды закрылі. А праз некалькі дзён пачула знаёмыя акорды — дачка стамілася ад танцаў і ўключыла сваю любімую песню — «Хоць паверце, хоць праверце...» з савецкага мультфільма «Папялушка», якой хутка будзе ўжо 50 (!) гадоў.

Успомніла ўласнае дзяцінства і ўявіла на хвілінку, што трывалі нашы бацькі ад трох дачок з улікам цалкам розных музычных густаў — адной падабалася Таня Буланава і ейныя «пакуты юнага Вертэра», што гучалі з кожнага праса, другая ўключала як мага гучней падлеткавы запал «Іванушак International», трэцяя пагрузілася ў панк-рок пад далёка не пяшчотныя песні «Сектара Газа» і крадком перапісвала ў сяброў касеты, ад гучання якіх, часта паўтарала мама, ва ўсяго пад'езда з'явілася заўчасная сівізна... Але галоўнае, за што, як падазравала тады і дакладна ведаю цяпер, варта было сказаць бацькам дзякуй — яны не перашкаджалі нам крыху шалець ад мітуслівай музычнай моды, нават калі тая часам была антымузычная, і праходзіць з любімымі выканаўцамі і гуртамі свае крызісы росту і сталення. Так што мы з сёстрамі адслухалі ўсё тое, пра што цяпер з усмешкай кажам: «Які жах нам падабаўся, уяві?» А паралельна міжволі прыслухоўваліся, як тата круціць пад настрой пласцінкі і касеты Уладзіміра Высоцкага, а мама падпявае ўлюбёным запісам Сальваторэ Адама і Джо Дасена. Прыслухоўваліся, нешта прапускалі міма вушэй, а сёе-тое ўбіралі ў сябе і пачыналі слухаць далей — музыку, якая падабалася нашым бацькам, іх бацькам і гэтак далей, ад фолку да джазу, ад року да класікі. Часам, прызнаюся, музычнай школы і «наслуханасці» не хапае, аднак сёння — залаты час, каб не толькі складаць свае асабістыя плэй-лісты, але і навярстаць прапушчанае, знайсці і пазнаёміцца з недаслуханым калісьці.

Я часта назіраю гэты эфект на розных музычных конкурсах — калі штогод пішуцца новыя песні, а сучасныя дзеці і падлеткі нярэдка выбіраюць для выканання не хіты-аднадзёнкі, а «класіку», старэйшую за іх саміх у шмат разоў. Помню, спецыяльна ўдакладняла ў педагогаў: вы параілі? «Ведаеце, гэтым дзецям ужо так проста не параіш, можна толькі падказаць, але музычны густ і «чуйку» яны маюць і выбіраюць кампазіцыі самі», — чула ў адказ. А самі юныя выканаўцы тлумачылі: проста песня спадабалася, і якая розніца, ці модная яна?.. З той пары я пра «сапраўдную музыку» ні з кім не спрачаюся — лічу, час лепей за любога знаўцу пакажа: ідзе гаворка пра «самы гарачы хіт бягучага лета», які забудзецца праз месяц, ці пра мелодыю, якая застанецца ў памяці слухачоў на доўгія гады.

Выбачайце, калі што, Клава і ўсе астатнія :)

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Сямейная газета

Выпуск № 14 (150)

Тыя, хто побач

Валерый ПРЫГУН:

«Каб шчасліва жыць у шлюбе, аднаго кахання недастаткова»

Вакальны гурт «Чысты голас».

Прыгожае мужчынскае шматгалоссе, якасны рэпертуар, які пастаянна абнаўляецца, высокая сцэнічная культура — усё гэта вакальны гурт «Чысты голас», якім кіруе Валерый ПРЫГУН. Жыццё артыста — канцэрты, гастролі, апладысменты, прыхільніцы... І гэта зусім не перашкаджае стабільнаму, а галоўнае, шчаслівому шлюбу. Жонка Валерыя Іна «адпрасілася» з інтэрв'ю, але сказала, што ёй будзе вельмі цікава яго пачытаць. А Валерый пажартаваў: маўляў, шмат цікавага даведаешся.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Двое — гэта...

НЯРОЎНЫ ШЛЮБ. ЧАМУ Б І НЕ?

Калі гадоў 30–40 таму адносіны, у якіх розніца ва ўзросце партнёраў складае 15–20 і больш гадоў, асацыяваліся з вядомай карцінай «Няроўны шлюб», то сёння — з галівудскімі славутасцямі і расійскімі селебрыці. «Няроўныя шлюбы» ў нашы дні нікога не здзіўляюць. Хоць па-ранейшаму часам выклікаюць асуджэнне, асабліва калі старэйшая ў пары — жанчына. Пра плюсы і мінусы адносін, у якіх адзін партнёр значна старэйшы за другога, мы размаўляем з псіхолагам-сексолагам Юліяй ХІНАВАЙ.

akloni.com

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

— На падсвядомым узроўні ў аснове любых працяглых адносін паміж мужчынам і жанчынай ляжыць тэма працягу роду (нават калі тыя не плануюць нараджэнне дзяцей). Пошук партнёра ажыццяўляецца ў магутным поле канкурэнцыі. Для здаровай мужчынскай канкурэнцыі неабходна наяўнасць двух складнікаў: сваёй справы, якая вылучае мужчыну з іншых, і жанчыны (пажадана легальнай — то-бок жонкі) для падмацавання мужчынскага статусу. Для здаровай жаночай канкурэнцыі неабходныя: наяўнасць мужчыны (пажадана легальнага — то-бок мужа) і дзіцяці (хоць аднаго) для пацвярджэння сваёй дзетароднай функцыі. Чым можа быць цікавы маладой жанчыне мужчына ва ўзросце? Тут на першы план выходзяць яго вопыт і мудрасць, гатоўнасць прымаць жанчыну такой, якая яна ёсць, паважлівае стаўленне да жанчыны, імкненне да стабільнага і спакойнага жыцця, самастойнасць, адказнасць за сям'ю, уменне зарабляць і ўкладваць свой даход у сумеснае жыццё (падарожжы, шопінг і іншае). Пакуль маладыя мужчыны-эксперыментатары шукаюць сябе метадам спроб ды памылак, у поле зроку маладых жанчын трапляюць узроставыя мужчыны. У сваю чаргу, многім маладым мужчынам падабаюцца жанчыны, старэйшыя за іх. Яны могуць сябе падаць, уважлівыя, самастойныя, дасведчаныя (у тым ліку і ў сексуальным жыцці), ураўнаважаныя, з дабрабытам, маюць сваё меркаванне.

(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)

Вольны час

СЯДЗІБЫ ПРАПАНУЮЦЬ:

хатка на дрэве, дзявочыя сакрэты і беларускія індзейцы

Басанож прабегчыся па расе, даведацца, як пахне чабор, пакаштаваць чарніцы з куста... Ну чаго яшчэ жадаць ад дзіцячага лета! І ўсё гэта можна падарыць хлопчыкам і дзяўчынкам, нават калі вашы бабулі даўно перабраліся жыць у горад, а лецішчам вы так і не абзавяліся. Цяпер аграсядзібы ладзяць разнастайныя летнікі для малых. Сёлета такі адпачынак асабліва запатрабаваны — у адрозненне ад звычайных стацыянарных лагераў, сядзібы прымаюць невялікія групы дзяцей, на што падчас каранавіруса бацькі звяртаюць увагу.

У вёсцы Зароўе Лепельскага раёна, што на Віцебшчыне, на гэты час тэрыторыя сядзібы «Лясны дом» ператварылася ў сапраўднае дзявочае царства. Кожная раніца ў маленькіх прыгажунь пачынаецца з ёгі і майстар-класаў па прыгатаванні розных жаночых штучак. Тут вараць мыла, робяць свечкі і ўпрыгажэнні, разам гатуюць прысмакі, знаёмяцца з зёлкамі, нарыхтоўваюць іх, вядуць дзённікі, ставяць спектаклі, танцуюць і спяваюць беларускія народныя песні, спасцігаюць сакрэты прыгажосці. А ўвечары паляць вогнішчы, чытаюць кнігі, іграюць на музычных інструментах. Тут можна быць самой сабой, дзяліцца з сяброўкамі патаемным, загадваць жаданні. Удалечыні ад гарадской мітусні дзяўчаты вучацца заўважаць, які непаўторны свет навокал, адчуваць яго гукі і водары, задумваюцца, што такое сапраўдныя харство, сяброўства, гармонія.

Побач у лесе разбіты палатачны гарадок для маленькіх мужчын. Аляксей Харужка — інжынер і выкладчык, арганізатар актыўных тураў і падарожжаў, які мае вопыт выжывання ў любой мясцовасці, а таксама Сяргей Цімавец — кіраўнік сядзібнага праекта «Лясны дом», прафесіянал у справе экабудоўлі, дзеляцца сваімі ведамі з хлопчыкамі. У праграме лагера — паходы, даследаванне закінутых месцаў у лесе, пошук былых пасяленняў людзей, навучанне лазанню па дрэвах са страхоўкай, вязанне вузлоў, назіранне за прыроднымі сістэмамі, вызначэнне напрамку руху рэк, даследаванне раслінасці на розных участках лесу, пабудова хаткі на дрэве і паходнай лазні, вязанне плыта і сплаў праз возера.

У вёсцы Маргі Глыбоцкага раёна адбываецца прысвячэнне ў «індзейцы». Незвычайны этналагер стварылі гаспадары аграсядзібы «Утрына» Наталля Трафімава і Раман Мельнічэнка. Тут хлопчыкі і дзяўчынкі вучацца ездзіць на конях, як гэта рабілі сапраўдныя індзейцы — без сядла. Даведваюцца, хто такія хаскі, катаюцца на іх, збіраюцца на савет каля вогнішча разам з павадыром Хуакасам, робяць сувеніры сваімі рукамі. Дарэчы, размяшчаюцца дзеці ў традыцыйным індзейскім жытле — ціпі.

А вось у «Таццянінай сядзібе», што ў вёсцы Шыпкі Вілейскага раёна на Міншчыне, гаспадары пастараліся стварыць такія ўмовы, каб дзеці адчувалі сябе як у гасцях у бабулі. Малыя жывуць ва ўтульным дамку ў пакоях на 2-4 чалавекі, побач — прыгожы сад, месцы для гульняў і тэраса, дзе можна праводзіць разнастайныя мерапрыемствы: танцы, спектаклі, дыскатэкі. А яшчэ іх чакаюць творчыя і кулінарныя майстар-класы, навучанне яздзе на конях, катанне на лодках, уласныя паказы мод і канцэрты...

Калі ж бацькі пакуль не гатовыя адпусціць малых адных у летнікі, можна паехаць у сядзібы разам. Сёння шмат прапаноў для сямейнага адпачынку. Чаму б не выбрацца з экскурсіяй на страўсіную ці слімаковую ферму, у кантактны заапарк, музей пчол або старажытных музычных інструментаў, у конны паход, вяровачны гарадок, не ўзяць напракат веласіпед альбо байдарку? Можна падарожнічаць па ўжо вядомых агратурыстычных маршрутах «Валожынскія гасцінцы», «Вялесаў шлях» ці апрабаваць новы «Муховецька кумора», які звязвае Кобрынскі і Жабінкаўскі раёны. Кожны такі маршрут аб'ядноўвае гаспадароў аграсядзіб, рамеснікаў, мясцовыя школы і ўстановы культуры, дорыць многа эмоцый, адкрыццяў і знаёмстваў.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

МЕЖЫ САМАСТОЙНАСЦІ, АБО ДЗІЦЯ — ТАКСАМА ЧАЛАВЕК

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Бацькі з моманту нараджэння дзяцей клапоцяцца і выхоўваюць іх, бо так задумана прыродай. Але тут вельмі важна вытрымаць баланс: з аднаго боку, правільна сарыентаваць сына ці дачку ў жыцці, а з другога — не разбурыць іх інстынкт самазахавання.

«Я ЛЕПШ ВЕДАЮ!..»

Адасабленне дзяцей ад бацькоў адбываецца паступова, калі з узростам маленькі чалавек пачынае асвойвацца ў навакольным свеце. Спачатку сын ці дачка спрабуюць самі дацягнуцца да цацкі, якая зацікавіла, потым выбіраюць, у чым пойдуць гуляць, а там (не паспееш і вокам міргнуць) — ужо расказваюць пра найлепшага сябра, мару стаць артыстам і ідуць на першы рок-канцэрт. І ў кожным з перыядаў жыцця дзеці робяць адкрыцці, спазнаюць сябе і «правілы гульні» ў дарослым свеце, а бацькі з'яўляюцца спадарожнікамі і дарадцамі. Аднак здараецца, што падтрымка дарослага, які знаходзіцца побач, не дапамагае, а наадварот — шкодзіць дзецям станавіцца самастойнымі. У псіхалогіі ёсць такое паняцце, як сепарацыя. Яно азначае адасобленасць паміж бацькамі і дзіцем. Калі ў трохгадовым узросце малое пачынае ўсведамляць сябе як асобу, то ў 12-13 гадоў запускаецца працэс самаідэнтыфікацыі і праяўляецца свая пазіцыя, а бліжэй да заканчэння школы маладыя людзі павінны быць гатовыя ўступіць у дарослае жыццё. У ідэале накіроўваць чалавека на гэтым шляху павінны бацькі, але часам пераход з формы зносін «дзіця—бацькі» ў прастору «дарослы—дарослы» даецца абодвум бакам складана.

Адзначаючы і 18-ы, і 25-ы дзень іх нараджэння, мы не заўсёды бачым ва ўчарашніх хлопчыках і дзяўчынках людзей, здольных адказна і стала праявіць сябе ў тых ці іншых абставінах. Нехта з іх працягвае жыць з бацькамі, іншыя скардзяцца на нелюбімага мужа альбо на шэфа, які «дастаў». Як правіла, такія людзі гатовы абвінавачваць у сваіх праблемах і няўдачах каго заўгодна, толькі не саміх сябе. Прычына такога стылю паводзін і ўспрымання абставін у многім абумоўлена якраз выхаваннем.

Глядзіце самі. Калі ў дзіцячым узросце сын ці дачка пачынаюць імкнуцца і вучацца рабіць нешта самастойна, іх ініцыятыва перапыняецца фразамі: «Асцярожна!», «Не лезь туды!», «Давай я табе дапамагу, я лепш ведаю як». Здавалася б, нармальная рэакцыя і жаданне дарослага і клапатлівага чалавека ў дачыненні да малечы. Але менавіта ў такія моманты мы, бацькі, маем усе шансы нашкодзіць.

БАЦЬКОЎСКІ МАКСІМУМ

— Калі казаць пра аддзяленне ад бацькоў, то гэты працэс пачынаецца ўжо з моманту нараджэння дзіцяці, але спачатку толькі на фізічным узроўні. У першы год яго жыцця абсалютна нармальна, калі маці шмат часу і ўвагі прысвячае малому, для якога важна адчуваць сябе любімым. Калі дзіця пачынае з узростам праяўляць больш актыўнасці (поўзае, ходзіць), то тут не варта спыняць яго, бо такім чынам вы не падтрымліваеце імкненне сваіх дзяцей да самастойнасці. Многія працягваюць рабіць усё замест сына ці дачкі: і кормяць з лыжачкі, і апранаюць і гэтак далей. Аднак важна, каб дзіця рабіла тое, што можа зрабіць само, без дапамогі бацькоў, — кажа **Вера ПРОХАРЧЫК, псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.** — Той жа трохгадовы ўзрост — гэта перыяд, калі дзеці пачынаюць разумець: я магу і хачу рабіць нешта без мамы, у мяне ёсць інтарэсы, якія могуць не супадаць з інтарэсамі дарослых. А потым чуюць: «ты яшчэ маленькі», «дай, я хутчэй усё зраблю». Такім чынам маці зноў аддаляе маленькага чалавека ад самастойнасці. А між тым вельмі важна дазваляць дзіцяці рабіць нешта самому, бо ў яго няма іншага спосабу спазнаць свет і набыць свой уласны вопыт, які спатрэбіцца яму ў жыцці...

Раздзяленне — гэта працэс, за які адказныя двое, дзіця і дарослы. Напрыклад, у тым жа падлеткавым узросце (яшчэ адзін крытычны перыяд) канфлікты паміж пакаленнямі абвастраюцца, бо дзеці пачынаюць ярчэй заяўляць пра свае жаданні, інтарэсы, ім цікавей быць сярод аднагодкаў, а бацькам яны часам могуць агучыць і сваё незадавальненне. Мамы і таты аказваюцца не падрыхтаваныя да такіх перамен, у сваю чаргу, уступаюць у спрэчку з пазіцыі «што ты бачыў у жыцці?» і такім чынам падаўляюць тую самастойнасць. Лепш, каб вашы дзеці чулі: «Я гатовы ў любы час выслухаць цябе! Я проста яшчэ не прывык да таго, што ты так хутка вырас».

Вельмі важную ролю адыгрывае прызнанне з боку бацькоў падлеткавай самастойнасці, павага да іх поглядаў і поспехаў — гэта ўзмацняе веру маладога чалавека ў сваю значнасць і падтрымлівае яго самаацэнку. Вось той максімум, які бацькі могуць даць сваім дзецям.

ЯК МАМА СКАЖА...

Разгледзім сітуацыю з фінансавай дапамогай. Зразумела, што ў любым узросце ў дзяцей ёсць пэўныя інтарэсы і жаданне іх задавальняць: набываць кнігі, цацкі, хадзіць з сябрамі ў кіно ці кавярню. Пакуль дзіця не зарабляе, яго жаданні аплачваюцца з бацькоўскага кашалька, і гэта нармальна. Аднак варта таксама тлумачыць яму, як зарабляюцца грошы, якія ў яго ёсць магчымасці падзарабіць. Тады вы будзеце стымуляваць дзяцей, каб у будучым яны выбралі такую прафесію, якая задаволіць іх патрэбы і жаданні.

Калі мы маем сітуацыю, дзе дзіця пазбаўлена магчымасці нармальна сталець, то атрымліваем інфантыльнага чалавека, які і ў дарослым жыцці працягвае арыентавацца на бацькоўскую падтрымку ва ўсім. У калектыве такі супрацоўнік рэдка выказвае сваю думку, адстойвае ўласную пазіцыю, а для стварэння сям'і шукае таго, хто будзе працягваць ва ўсім апякаць, як рабілі гэта ўвесь час маці і бацька. Наўрад ці побач з такім чалавекам людзям будзе камфортна і цікава, а тая ж яго сям'я атрымаецца шчаслівая. А бацькі потым здзіўляюцца, маўляў, «дзеці нічога не ўмеюць, не ведаюць, чаго хочуць»... Каб чалавек меў сваё меркаванне і ведаў, да чаго імкнецца, яму патрэбна магчымасць самому дайсці да адказаў на тое ці іншае пытанне пра сябе і навакольны свет. Толькі так фарміруецца характар і сталее асоба, адшукваюцца маршруты да ўласнага шчасця, да самога сябе.

Алена ДРАПКО.

ЁСЦЬ ТАКІ ІНСТЫТУТ

Памяняць свае погляды і перакананні дзеля захавання сям'і ніколі не позна

Якія праблемы існуюць у сям'і, як можа дапамагчы ў іх вырашэнні медыяцыя, ці трэба ўвогуле да яе звяртацца? Над гэтымі і іншымі пытаннямі на вэбінары, прысвечаным захаванню міру ў сям'і, разважалі спецыялісты.

«Усё на жонцы, а муж — на рыбалцы»

Добра вядома, што сям'я — аснова станаўлення чалавека. Што ты вынесеш ад бацькоў, тое прынясеш і ў сваю сям'ю. Аднак часта моладзь успрымае шлюб як канчатковую мэту, пасля якой можна расслабіцца і адпачыць. Між тым патрэбна пастаянная работа над сабой, над узаемаадносінамі з навакольнымі: «другой паловай», калегамі, настаўнікамі сваіх дзяцей, спецыялістамі розных устаноў.

Жыццёвы цыкл сям'і — гэта яе гісторыя ад моманту сустрэчы сужэнцаў да старасці. Час ад часу ў ёй адбываюцца змены, менавіта яны называюцца крызіснымі перыядамі сямейнага жыцця. Важна разумець, што на гэтых этапах шлюб павінен рэарганізавацца для вырашэння новых задач і выбару новых правіл. Калі гэтага не адбываецца, сямейная сістэма дэстабілізуецца, папярэджвае **Вольга МАЦЮХОВА, начальнік Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі:**

Механізм прымірэння мужа і жонкі ў выглядзе адтэрміноўкі на тры і шэсць месяцаў пры разглядзе іскавай заявы аб скасаванні шлюбу з'яўляецца толькі пасіўнай спробай вырашыць праблему.

— Кожны перыяд характарызуецца тыповымі праблемамі, якія трэба ўмець пераадолець. Калі ж сужэнцы не могуць адразу падстроіцца пад змены чарговага этапу развіцця сям'і, узнікаюць праблемы. Яны могуць узмацніцца, калі муж і жонка працягваюць захоўваць на гэтым цыкле свае прыярытэты, не мяняючы іх.

Адзін з такіх важных этапаў — з'яўленне дзіцяці і падзел роляў, звязаных з мацярынствам і бацькоўствам. Для гэтага перыяду характэрнае з'яўленне задач па доглядзе малога і звужэнне зоны стасункаў жонкі. Тут важна ўмець дамаўляцца і камунікаваць. Могуць з'явіцца праблемы з адзінствам патрабаванняў да дзіцяці і рознагалоссі па пытаннях выхавання, расказвае Вольга Мацюхова.

— Як паказвае практыка, жанчына ў перыяд догляду немаўляці намагаецца амаль усё ўзяць на сябе. Так спрадвеку склалася, што жонка адваёўвае гэтую ролю ў мужа. Яна кажа: «не так трымаеш», «лепш паглядзі, як мама мая робіць», «мне не да цябе цяпер, я малым занятая». І калі жанчына праз нейкі час гатовая далучыць мужа да выхавання, ён ужо з сябрамі на рыбалцы ці ў гаражы. Пачынаецца канфлікт, які негатыўна адбіваецца на дзіцяці. Немаўляці, вядома, патрабуецца догляд, але ж абодвух бацькоў, а не толькі матулін.

Як паказвае практыка, часта сужэнцы прыходзяць на кансультацыю па дзіцячых пытаннях і ў размове са спецыялістам выходзяць на канфлікты паміж сабой, якія ўзніклі праз тое, што муж і жонка чакалі адно ад аднаго ўступак і разумення, але не бачылі пры гэтым сваёй ролі і адказнасці. «Яна сама павінна разумець, што я ад яе хачу», «ён першы пачаў, цяпер хай сам выпраўляе» — такія разважанні спецыялісты чуюць вельмі часта.

www.7ya.ru

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Агрэсія, патуранне, злоўжыванне...

З верасня 2019-га ў Цэнтр паступіла 407 зваротаў па пытаннях вырашэння канфліктаў. Пры гэтым спецыфіка зваротаў завязана перш за ўсё з дзіцяча-бацькоўскімі адносінамі (81 %), 16 % — праблемы са школьным асяроддзем, 3 % — канфлікты паміж сужэнцамі.

Псіхаэмацыянальнае напружанне ў дзяцей можа ўзнікаць праз асаблівасці камунікацыі паміж членамі сям'і. Дзеці капіруюць рэакцыі і паводзіны бацькоў, у прыватнасці агрэсію. А вось патуранне капрызам малога вядзе да таго, што дзіця перастае ўспрымаць дарослага як прыклад, а выкарыстоўвае яго для задавальнення сваіх патрэб, маніпулюючы ім. Неспрыяльна адбіваюцца на малых і пастаянныя канфлікты, звязаныя з эканамічнымі і бытавымі праблемамі, а таксама развод, якому папярэднічаюць спрэчкі. Яшчэ адна праблема, калі хтосьці з членаў сям'і псіхатропнымі рэчывамі злоўжывае. Гэта цягне канфлікты сям'і з соцыумам.

— Сям'я — сістэма ўзаемаадносін, у праблемах сям'і закладзена кругавая прычыннасць — перадача мадэлі паводзін ад аднаго пакалення да наступнага. Калі самі бацькі не ўмеюць камунікаваць, то і ў дзяцей з гэтым узнікнуць праблемы, — расказала начальнік Цэнтра.

Досыць шмат запытаў паступае і з адміністрацый устаноў адукацыі аб дапамозе ў вырашэнні канфліктных сітуацый. Гэта падкрэслівае, што медыяцыя — кірунак, які сёння вельмі запатрабаваны.

— У ім зацікаўлены не толькі кіраўнікі школ, але і бацькі, якія звяртаюцца ў Цэнтр. Пасля яны разумеюць, што самі не ўмеюць узаемадзейнічаць канструктыўна, але ёсць іншыя шляхі вырашэння іх праблем. Калі прыходзіць усведамленне гэтага, мы можам рушыць далей і пераадольваць цяжкасці, — удакладняе Вольга Мацюхова.

Супрацоўніцтва лепшае за прымус

За мяжой медыяцыя паспяхова ўжываецца яшчэ з мінулага стагоддзя. 70–85 % спраў, якія перадалі на медыяцыю, заканчваюцца паспяхова, і бакі ўвогуле не звяртаюцца ў суд. А вось у заканадаўстве Беларусі да нядаўняга часу не было дзейсных працэдур, якія б дазвалялі паспрыяць захаванню сям'і, дзе сужэнцы хочуць развесціся. Механізм прымірэння мужа і жонкі ў выглядзе адтэрміноўкі на тры і шэсць месяцаў пры разглядзе іскавай заявы аб скасаванні шлюбу з'яўляецца толькі пасіўнай спробай вырашыць праблему. Станоўчы эфект па захаванні сям'і назіраецца менш чым у 0,4 % выпадкаў, заўважыла **Наталля ГУЙВІК, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі 5-га і 6-га скліканняў, суддзя з 13-гадовым стажам, медыятар.** Яна была адной з тых, хто актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы змен у закон аб шлюбе і сям'і, які пашырыў магчымасці медыяцыі ў сферы сямейна-шлюбных адносін і з 1 ліпеня ўступіў у сілу.

— Сёння можна з гонарам казаць, што ўключэнне інстытута сямейнай медыяцыі ў заканадаўства краіны было недарэмным. Пра станоўчыя вынікі кажуць самі медыятары, і гэта толькі пачатак. Хутка і большасць насельніцтва зразумее ўсе плюсы медыяцыі. З 2008 года ў гаспадарчых судах краіны ўжо працуюць прымірыцелі, з дапамогай якіх вырашаецца большасць гаспадарчых спрэчак. Прыклад іх работы фактычна стаў асновай для фарміравання медыяцыі ў Беларусі, — адзначае Наталля Гуйвік. — У сістэму сям'і ўцягнуты і бацькі сужэнцаў, і іх сябры, і суседзі. На кожныя 100 шлюбаў у Беларусі прыходзіцца 50 разводаў, якіх можна было б пазбегнуць, калі б да дапамогі ў прымірэнні прыцягвалі трэці, незалежны бок не падпарадкаваны строгім правілам судовага працэсу, — медыятара. Медыятыўная дапамога больш дзейсная, чым тэрмін для прымірэння, які прызначаецца судом.

Выкарыстанне інструментаў медыяцыі — надзейны і правільны крок, які мае шэраг пераваг перад судовым разборам. Працэдуру медыяцыі нельга разглядаць як адзін з відаў апошняга. Удзел у медыяцыйным працэсе цалкам добраахвотны, не мае строгіх рамак правядзення, як суд, а рашэнні прымаюць самі бакі, а не суддзя.

«На кожныя 100 шлюбаў у Беларусі прыходзіцца 50 разводаў, якіх можна было б пазбегнуць, калі б да дапамогі ў прымірэнні прыцягвалі трэці, незалежны бок».

— Мараль і супрацоўніцтва заўжды лепшыя за догмы і прымус. Падчас медыяцыі можна захаваць таямніцу канфлікту і цалкам абмеркаваць усе яго нюансы, а прымірыцца не пасля судовага рашэння, а шляхам дамаўлення, пасля чаго захаваць добрыя адносіны, — запэўніла Наталля Гуйвік.

На жаль, многія медыятары пакуль працуюць на грамадскіх пачатках, а грамадства дагэтуль не вельмі давярае гэтым спецыялістам і ідзе ў суд. Першапачаткова яшчэ пры распрацоўцы змен у закон аб медыяцыі меркавалася ўвядзенне гэтай працэдуры як абавязковага дасудовага парадку ўрэгулявання асобных спрэчак у межах шлюбна-сямейных адносін. Суду хацелі даць паўнамоцтвы накіроўваць бакі на абавязковую інфармацыйную сустрэчу з медыятарам.

— Адстаяць гэтыя нормы, на жаль, не ўдалося, — заўважыла медыятар. — Такі падыход, на думку некаторых экспертаў, парушае галоўны прынцып медыяцыі — добраахвотнасць. Аднак абавязковая медыяцыя не супярэчыць прынцыпу добраахвотнасці, а з'яўляецца адным са спосабаў рэалізацыі публічнага інтарэсу дзяржавы па гарманізацыі сямейна-прававых адносін. Добраахвотнасць прадугледжвае наяўнасць у бакоў волевыяўлення на вырашэнне канфлікту. Заканадаўства, як правіла, абавязвае бакі пайсці на інфармацыйную сустрэчу з медыятарам і на ёй даведацца, што гэта за працэдура. А ўжо пасля сужэнцы самі вырашаць, ці трэба ім у ёй удзельнічаць. Я ўпэўнена, што будучыня ў нашай краіне — за абавязковай медыяцыяй, бо многія краіны даўно і паспяхова выкарыстоўваюць яе як абавязковы этап на шляху ўрэгулявання сямейных канфліктаў.

Гэта практыкуецца, напрыклад, у ЗША, Аўстрыі, Фінляндыі, Італіі, Новай Зеландыі, Вялікабрытаніі, Канадзе і іншых краінах. У апошніх дзвюх аплату працэдуры для бацькоў, якія спрачаюцца, бяруць на сябе дзяржава ці грамадскія арганізацыі.

Ірына СІДАРОК.

Давай пагаворым

І СМЕХ, І СЛЁЗЫ, І... ВІДЭАСУВЯЗЬ

ЯК У БАРЫСАВЕ ДАПАМАГАЮЦЬ ЧАСОВА АБ'ЯДНАЦЦА ДЗЕЦЯМ І ЗНЯВОЛЕНЫМ БАЦЬКАМ

Унікальны сацыяльны праект «Тата побач. Мама, давай пагаворым» рэалізуецца ў Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Бацькі, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых установах, займелі магчымасць пагутарыць са сваімі дзецьмі па відэасувязі. Для гэтага ўладкаваны асобны пакой, у якім наведвальнікі адчуваюць сябе камфортна і ўтульна.

Дамашнюю атмасферу ствараюць мяккая мэбля, кнігі на паліцах, шматлікія цацкі для маленькіх. На сцяне — вялікі манітор, дзе яны могуць убачыць сваіх матуль і татаў, па якіх паспелі засумаваць.

На здымку каманда праекта — *справа налева:* загадчыца бібліятэкі Алена КАПЫТОК, галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Святлана ШЧЭРБА, загадчыца дзіцячага аддзела Марыя ОКАЛА-КУЛАК, загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Людміла КАНАШЭЎСКАЯ.

— У снежні кіраўніцтва папраўчай калоніі № 14 у Навасадах, што паблізу Барысава, запрасіла дырэктара бібліятэкі Алену Капыток і кіраўнікоў іншых устаноў культуры на спектакль і экскурсію. Менавіта тады і адбылося знаёмства Алены Сяргееўны з намеснікам начальніка калоніі па папраўчым працэсе Дзмітрыем Несцяровічам, — расказвае **загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Людміла КАНАШЭЎСКАЯ.** — У студзені–лютым яна ў складзе групы прафесійнага абмену пабывала на стажыроўцы ў ЗША, дзе пазнаёмілася з работай бібліятэк шасці штатаў, а менавіта ў Бруклінскай публічнай бібліятэцы яе зацікавіў вопыт праекта TeleStory для сем'яў асуджаных, і яна вырашыла перанесці вопыт амерыканцаў на барысаўскую глебу. Галоўны пасыл праекта, які, дарэчы, у Беларусі ўнікальны і адзіны такога накіравання — гэта арганізацыя цыклу анлайн-сустрэч у бібліятэцы асуджаных бацькоў (таты або матулі) са сваімі дзецьмі і сумесныя чытанні кніг, размовы аб прачытаным, пра жыццё. Абавязкова маленькі ўдзельнік сустрэчы атрымоўвае ў падарунак кнігу, якую чыталі падчас сустрэчы. Ідэяй рэалізацыі дырэктар бібліятэкі падзялілася з Дзмітрыем Несцяровічам, які яе актыўна падтрымаў.

Калі ствараўся праект, першапачаткова яго назвалі «Тата побач, давай пагаворым». Але за кратамі сядзяць не толькі таты, але і мамы. Прычым асуджаныя з горада і раёна адбываюць пакаранне і ў іншых месцах зняволення на тэрыторыі Беларусі. І калі іх пачалі шукаць, то выйшлі на Гомельскую жаночую калонію. Таму давялося памяняць назву праекта на «Тата побач. Мама, давай пагаворым». На першую сустрэчу прыйшла бабуля з дзвюма ўнучкамі. Жанчына не сказала дзяўчаткам, што яны хутка пабачаць сваю маму. Спатканне аказалася нечаканым, вельмі пранікнёным і эмацыянальным. «Малышы мае родныя, добры дзень!» — павітала дачушак матуля.

— І мы асэнсавалі значнасць гэтага праекта, бо ён сапраўды стымулюе людзей станавіцца на шлях выпраўлення, каб хутчэй злучыцца са сваімі сем'ямі, дзеткамі. Каштоўнасць яго яшчэ і ў тым, што мы змаглі сумясціць самую ізаляваную супольнасць і самую даступную і адкрытую ўстанову — бібліятэку. Тым самым далі магчымасць аб'яднацца сем'ям на працягу гадзіны, — адзначае Людміла Мікалаеўна.

У бібліятэцы ўлічылі і той момант, што гэта сямейная сустрэча. Калісьці цяперашнія зняволеныя чыталі перад сном сваім дзецям любімыя казкі, вершы. Такую магчымасць яны атрымалі і цяпер — па відэасувязі. Напрыклад, адзін з мужчын прачытаў сваім дзецям урывак з твора Міхася Лынькова «Васількі». Варта дадаць, што бацькі карпатліва рыхтуюцца да такой падзеі, дэкламуюць творы старанна, выразна, з душой.

— Вельмі шчымлівай стала другая сустрэча, калі маці прывяла на яе пяцярых малых. Мы зразумелі, што патрэбны не толькі цацкі, але і салодкія пачастункі, што трэба пашырацца, прыўносіць у праект нешта новае. Мы выйгралі гран-пры рэспубліканскага конкурсу Social Weekend і атрымаем 10 тысяч рублёў, на якія купім пазлы, мазаікі, канструктары, наборы для творчасці, ратоны, настольныя і магнітныя гульні, розныя салодкія наборы, камплекты літаратуры — па адным для бібліятэкі, гасцей і калоніі, — кажа Людміла Канашэўская.

Сустрэчы арганізатары стараюцца прыморкаваць не толькі да нейкіх асаблівых дат, але і запрасіць на сустрэчы знакамітых людзей. Напрыклад, напярэдадні 9 Мая на ёй прысутнічала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Лілія Ананіч.

Адна з жанчын прыехала з сынам з Мінска. Тата пачытаў малому яго любімую казку «Тры парасяці». Пасля сустрэчы хлопчыка запрасілі пазнаёміцца з лялечнымі героямі казкі, а таксама — з незвычайнымі кнігамі і настольнымі гульнямі структурнага падраздзялення Залы літаратуры на замежных мовах — партнёрскага цэнтра BorisovInvoUSA.

Як высветлілася падчас адной з сустрэч, 13-гадовая дзяўчынка вельмі захапляецца Японіяй, анімэ. Для яе супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі карту гэтай краіны з адметнымі месцамі. Бацька прачытаў дачцэ верш японскай дзяўчынкі, так што сустрэча атрымалася тэматычная. Мужчына запэўніў, што пасля вызвалення ён абавязкова наведае бібліятэку і будзе дапамагаць яе супрацоўнікам, магчыма, у якасці валанцёра.

Работнікам установы вельмі ўдзячны і зняволеныя, і члены іх сем'яў, і дзеці, пра што сведчаць запісы, пакінутыя ў спецыяльнай кнізе, малюнкі дзяцей. А бабуля, якая прыляла на відэасувязь з маці дзвюх дзяўчынак, нядаўна зноў зазірнула ў бібліятэку, каб падзяліцца радасцю — ёй дазволілі спатканне з дачкой. Яны згадвалі з ёй пра тую відэаканферэнцыю, жанчына была вельмі ўдзячная, што пабачыла сваіх дачушак.

Праект разлічаны на год, ужо адбылося пяць сустрэч. Яны праходзяць два разы ў месяц, звычайна па пятніцах. А гэта значыць, што яшчэ шмат сем'яў могуць уз'яднацца і атрымаць масу пазітыўных эмоцый. Няхай часова, няхай па відэасувязі.

У планах на будучыню — праект будзе развівацца, праводзяцца перамовы на ўдзел у ім усіх папраўчых устаноў краіны. Значыць, што яшчэ больш маленькіх сардэчак будуць прыемна ўсхваляваны сустрэчай не толькі з мамай і татам, але і з добрымі кнігамі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

#ЯЖМАЦІ

Пасябраваць з «ворагам»

Хлопчыка частуюць цукеркай. Ён дзякуе і хоча з'есці ласунак, але раптам бачыць, як глядзіць на яго сястрычка. Брат пяшчотна гладзіць малую па галаве і ўпэўнена дзеліць цукерку напалам. Пасля яны бяруцца за рукі і весела ідуць гуляць разам.

Калі я зацяжарала другім дзіцем, то менавіта так і ўяўляла сабе адносіны паміж братам і сястрой. У мяне таксама ёсць брат, і не адзін. Але менавіта той, задуманы як мой сябар і маладзейшы за мяне на два з паловай гады, стаў ледзь не «кроўным ворагам». Памятаю, гуляю ў «садок» з малымі, двума самымі малодшымі брацікамі. Я — добрая выхавацелька. Усіх паклала спаць і сяджу за сталом, нешта пішу ў сшытку. І тут урываецца мой «брататвораг» і крычыць на ўсё горла: «Пад'ём, фашысты напалі!» Малыя падскочылі і з крыкамі пабеглі за ім. О, як я яго ў той момант ненавідзела! Якія будавала планы помсты!.. Калі ж сама ўжо стала мамай, то думала, што мая маці, відавочна, нешта рабіла не так. Трэба было навучыць нас гуляць разам і дружна. Гэтым я збіралася заняцца пасля нараджэння другога дзіцяці, потым старалася яшчэ больш пасля з'яўлення трэцяга і, нарэшце, чацвёртага... Прызнаюся, што мой план праваліўся. Я не змагла ўвасобіць тую карцінку адносін, якую намалявала ў сваёй галаве. Мае дзеці не могуць знаходзіцца разам на адной прасторы даўжэй за дзве гадзіны, калі больш — баталіі непазбежныя. Прычынай можа стаць што заўгодна: цацка, сшытак, аловак, печыва, схопленае адначасова, паглядзеў не так, сказаў не тое... Выконваю ўсе парады псіхолага. У кожнага ёсць свая прастора ў доме, кожнаму індывідуальна ўдзяляю час, вучу дамаўляцца, расказваю пра міласэрнасць і любоў у сям'і, больш за тое, — кожны з маіх дзяцей наведвае розныя ўстановы адукацыі, гэта значыць, нават удзень яны не бачаць адно аднаго. Мне здавалася, што так яны будуць сумаваць па родных, але не. Псіхолаг абяцае вынік, але пазней... Я згаджаюся і чакаю.

Гэтым летам нам выпала паехаць на ўсе летнія канікулы ў вёску. Мае дзеці гарадскія і наогул пераважна занятыя цэлы дзень: гімназіі, гурткі, музычная школа, а тут увесь час разам! Спадзявалася на тое, што ім проста давядзецца дамаўляцца, хоць з міласэрнасці і любові да мяне, але...

— Ах так! — крычыць раз'юшана Уля свайму брату. — Табе капец!

Міша здзекліва смяецца ўголас.

— Што ты мне можаш зрабіць, маляўка? — сын вылазіць з пабудаванага дзецьмі дамку, з якога быццам выпадкова выштурхнуў Ульку.

Я з папрокам гляджу на сына. Улька выбягае на вуліцу. Праз пяць хвілін вяртаецца і рашуча падыходзіць да Мішкавага ложка.

— Глядзі, што ў мяне! — крычыць з выклікам брату.

Мішка бялее. Ён страшэнна баіцца павукоў. А тут тоўсты і чорны павук спрабуе вырвацца з рук дзяўчынкі. Уля злавесна смяецца і... адпускае яго на ложак брата. Міша зрываецца з месца, каб правучыць сястру, але перадумвае: мама адбярэ за гэта тэлефон. Бяжыць да мяне і патрабуе пакарання сястры — незадаволены вынікам, пануры вяртаецца ў пакой. І раптам, на шчасце Мішкі, туды з ім залятае аса. Хлопчык не адчувае страху перад небяспекай быць укушаным, а вось Уля да істэрыкі баіцца ўсіх паласатых насякомых. Секунда — і Міша зачыняе акно, каб аса не паспела вылецець. Уля, разумеючы ўвесь жах сітуацыі, кідаецца да дзвярэй, але Міша паспявае зачыніць дзверы і трымае іх, каб сястра не выбралася. Малая ў адчаі пачынае раўці...



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Першыя тыдні падобныя сітуацыі здараліся кожны дзень. І, калі шчыра, я ўжо думала, што ідэя адпачыць летам разам, пэўна, была памылкай... Але апошні тыдзень усё часцей чую смех малых, бачу, як яны весела гуляюць разам у басейне, катаючы малодшую сястрычку на надзіманым крузе, як разам здымаюць «страшнае відэа» на гарышчы, як падчас прагляду любімага фільма хвалююцца за Тома Соера, калі той збягае ад злога індзейца. І цеплюцца ўва мне надзея, што, можа, калі-небудзь яны будуць сядзець за кубачкам гарбаты ды ўспамінаць сваё дзяцінства з цеплынёй, як, зрэшты, і я са сваім «брататворагам».

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

«Каб шчасліва жыць у шлюбе, аднаго кахання недастаткова»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Пачнём з нашага традыцыйнага пытання: як вы пазнаёміліся з будучай жонкай?

— Мабыць, сам лёс нас звёў. Іна родам з горада Наварасійска, што на Чорным моры. У той год з сябрамі адпачываў у выдатным курортным месцы Шырокая Балка, што за 10 кіламетраў ад горада. Вось там мы і пазнаёміліся. Цікава, што Іна вучылася ў Мінску і прыехала дадому на канікулы. Прыгожая дзяўчына, амаль «зямлячка», адразу знайшліся тэмы для размоў і абмеркаванняў, ну, і мы былі з гітарай і песнямі пад яе... Мора, лета і ўзаемная сімпатыя. Потым — сустрэчы ў Мінску, кветкі, кампліменты, заляцанні два гады — і вось мы ўжо 28 гадоў разам.

«Жанчына ў большай ступені адказвае за побыт і ўтульнасць у доме, а мужчына — за забеспячэнне гэтага побыту і дабрабыту сям'і. Але нічога дрэннага не бачу ў тым, што ролі раптам па нейкіх прычынах памяняліся».

— Хвалявалiся перад знаёмствам з бацькамі нявесты?

— Упершыню з бацькамі Іны я ўбачыўся праз год. Напачатку была лёгкая насцярожанасць з іх боку: музыкант, з гітарай, доўгія валасы, не мясцовы. Але неяк лёгка ўсё наладзілася, мы знайшлі агульную мову з цесцем, а цешча ў мяне — самая лепшая ў свеце! У нас выдатныя адносіны.

З маімі бацькамі Іна пазнаёмілася крыху пазней, яе прынялі ў сям'ю, і яна адразу стала «дачкой». Першы час мы жылі разам з маімі бацькамі, але кухня павінна быць у кожнай гаспадыні свая. Чаго і жадаю ўсім маладым. Не сакрэт, што многія канфлікты адбываюцца і пачынаюцца менавіта там.

— Вы спраўлялі вяселле? Што больш за ўсё запомнілася?

— Вяселле была традыцыйнае: жаніх у касцюме, нявеста ў вэлюме і прыгожай белай сукенцы. Запрасілі сваякоў, сяброў. Распісваліся мы ў ЗАГСе, што ў Траецкім прадмесці, а вянчаліся ў Кафедральным саборы. Вясельных агенцтваў у наш час не было, таму ўсё рабілася сваімі сіламі. Музыка, танцы, забавы, балазе, усе мае сябры творчыя людзі. Выкуплялі нявесту, выкрадалі і г. д. Вяселле прайшло хораша, з добрай музыкай, гулялі два дні. На мой погляд, гэта добрая традыцыя. Хтосьці яшчэ дадае розныя абрады і сцэнкі з фальклору. Усё гэта ўпрыгожвае і ўносіць разнастайнасць у цырымонію шлюбу. У правінцыі гэтага больш, у горадзе менш. Сённяшняй моладзі ўсё гэта не вельмі падабаецца, яна і на шлюб глядзіць сёння па-іншаму.

— Так, раней укладвалі душу ў падрыхтоўку вяселля, крэатывілі самі, цяпер усё аддаюць на водкуп агенцтвам.

— Там фантазіі абмяжоўваюцца толькі бюджэтам. Паслугі прапануюць на любы густ і колер, і гэта добра, калі ёсць выбар. Але я таксама абсалютна нармальна стаўлюся да таго, што маладыя ўсе выдаткі скарачаюць, збіраюцца вузкім колам і абмяжоўваюцца хатняй вячэрай у коле блізкіх і сяброў. Сёння сапраўды не ўсе могуць дазволіць сабе зрабіць вяселле ў рэстаране на 50-100 чалавек. Ну і нічога. Ёсць на што выдаткаваць грошы маладым. У іх усё жыццё наперадзе. Але будзе шкада, калі ўся гэта нацыянальная разнастайнасць абрадаў і традыцый знікне з часам, а ўзамен мы атрымаем анлайн-рэгістрацыю, віншаванні ў месенджары і сэлфігасцей.

— Вы да рэгістрацыі шлюбу дамаўляліся, як падзеліце хатнія абавязкі, як будзеце распараджацца фінансамі, ці ўсё гэта неяк само сабой усталявалася?

— Я за раўнапраўе ў сям'і і разумнае размеркаванне абавязкаў. Жанчына ў большай ступені адказвае за побыт і ўтульнасць у доме, а мужчына — за забеспячэнне гэтага побыту і дабрабыт сям'і. Але нічога дрэннага не бачу ў тым, што ролі раптам па нейкіх прычынах памяняліся. Галоўнае, у сям'і павінны быць паразуменне, любоў і павага адно да аднаго. І тады можна прайсці праз любыя цяжкасці.

— А да дачкі ў школу на бацькоўскі сход хто хадзіў?

— Часцей школу наведвала Іна, хоць і я там бываў, калі дазваляў час. Я памятаю, што татаў і мам на сходах было амаль пароўну... Ці гэта толькі калі я там быў?

«Кухня павінна быць у кожнай гаспадыні свая. Чаго і жадаю ўсім маладым. Не сакрэт, што многія канфлікты адбываюцца і пачынаюцца менавіта там».

— Нядаўна прачытала артыкул замежнага псіхолага, дык ён сцвярджае, што ў сямейным жыцці адбываецца аж сем крызісаў. А вы колькі налічылі? Або шчасліва іх пазбеглі?

— Не ведаю, можа, яны і ёсць у некага, але нам удалося пазбегнуць гэтага. Калі крызісы і былі, то яны прайшлі незаўважна для нас, не засталіся ў памяці. Часам трэба проста кубак кавы ў ложак або букет любімых кветак прынесці — і табе даравалі. Трэба навучыцца або прымусіць сябе чуць і разумець другую палову. Мы ўсе людзі розныя, кожны са сваімі «прыбамбасамі». Да вяселля я рабіў так: шкарпэткі кінуў, кубак не памыў ці не так паставіў, а цяпер трэба па-іншаму. Думаю, што аднаго кахання недастаткова, каб шчасліва жыць у шлюбе. Сям'я — гэта вялікая праца двух людзей, і калі да гэтага яшчэ ёсць любоў, вось тады гэтую сям'ю можна лічыць шчаслівай. І такіх прыкладаў вельмі шмат. Жыццё — яно як «зебра»: то белая паласа — узлёт, то чорная — падзенне. У сям'і ўсё тое ж самае: лаюцца, мірацца, саступаюць, згаджаюцца... А яшчэ павінна быць павага, без гэтага ніяк.

«У нас любімыя жонкі і дзеці, і кожны даражыць гэтым. Калі ў чалавека ў сям'і ўсё добра, то навошта яму шукаць нешта іншае?»

— «Чысты голас» — адзін з самых папулярных калектываў, у якога шмат прыхільніц. Ці былі ў вашым жыцці сцэны рэўнасці з боку Іны?

— Я стараюся не даваць падстаў для гэтага. Вядома, да нас, артыстаў, больш увагі з боку супрацьлеглага полу. І шмат прыхільніц, і кветкі, і розныя падарункі робяць, і паветраныя пацалункі шлюць, і фота на памяць з любімым артыстам хочуць мець. Я думаю, усё гэта ёсць у кожнага вядомага чалавека, галоўнае — як ты да гэтага ставішся. Гэта частка нашай работы: дарыць людзям цяпло, настрой, усмешкі і, вядома, нашы песні. Ты павінен быць адкрытым і шчырым, камусьці падмігнуць, камусьці ўсміхнуцца, а людзі дораць табе ў адказ сваю любоў. Але думаю, што ўсё-ткі жонка крыху раўнуе.

— Існуе даволі распаўсюджаны стэрэатып, што артысты — людзі легкадумныя, і 2-3, а часам і больш шлюбаў — гэта норма. А як у артыстаў «Чыстага голасу» складваецца сямейнае жыццё?

— У нашым калектыве і ў маіх блізкіх сяброў стабільныя сем'і. У нас любімыя жонкі і дзеці, і кожны даражыць гэтым. Калі ў чалавека ў сям'і ўсё добра, то навошта яму шукаць нешта іншае?

У сілу нашай работы мы часта выязджаем з дому. Канцэрты, гастролі... Сумуем па нашых родных і блізкіх, і заўсёды прыемна вярнуцца дадому, дзе цябе любяць і чакаюць. Так што мы не трапляем пад гэтыя стэрэатыпы.

З дачкой Кацярынай.

Не ва ўсіх так атрымліваецца, як у нас. Вядома, творчыя людзі — сапраўды асаблівыя, трошкі вар'яты ў добрым сэнсе слова. Яны па-іншаму глядзяць на свет і адчуваюць яго па-іншаму, часам не заўважаючы самых простых рэчаў. У іх больш тонкае і маляўнічае ўспрыманне ўсяго, што навокал. Другім палавінкам трэба ох як пастарацца, каб прывыкнуць і ўжыцца з такімі людзьмі.

А два-тры і больш шлюбаў бывае не толькі ў творчых людзей, і гэтаму таксама шмат прыкладаў. Але артысты навідавоку, пра іх пішуць і расказваюць. Вельмі часта нават жорстка ўмешваюцца ў асабістае жыццё ў пагоні за фактам або рэдкім фота... Гэта выдаткі прафесіі. Кожны ставіцца да гэтага па-рознаму. Хтосьці выстаўляе сваё асабістае напаказ, хтосьці хавае...

Дзе мы сустракаем свайго чалавека і потым улюбляемся ў яго? У «арэоле пражывання», калі так можна сказаць. А калі ты ў сваёй рабоце кожны дзень сустракаешся ці бачыш тысячы людзей, прыхільніц, робіш сумесныя праекты з такімі ж таленавітымі і творчымі людзьмі, ты ўлюбляешся ў іх, ты з імі на адной хвалі, у адной тэме. Потым з'яўляюцца іншыя ідэі і планы, новыя выступленні — і ўсё па новай... Улюблівасць уласцівая творчым асобам — можа, адсюль і столькі шлюбаў у розных вядомых людзей. Напэўна, гэта пытанне больш да псіхолагаў. А наогул наш свет розны, і людзі ў ім розныя, у гэтай разнастайнасці ўвесь кайф жыцця. І наўрад ці можна да ўсяго ўжыць нейкае адно правіла або сістэму.

— Якім уяўляеце дзень свайго залатога вяселля?

— Мы толькі 28 гадоў разам, залатое яшчэ не хутка. Хацелася б, каб сабраліся ўсе сябры, сваякі, дзеці і ўнукі. Пасядзець за сталом, успомніць пра былое і добра адзначыць. Галоўнае, каб хапіла здароўя. Хацелася б, гуляючы па вуліцы, як і цяпер, трымацца за рукі, з любоўю жартаваць адно над адным. Разам паглядзець серыял, а потым футбол. Зазірнуць у вочы жонцы і сказаць: «Як жа я цябе кахаю!»

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з сямейнага архіва Валерыя Прыгуна і сайта вакальнага гурта «Чысты голас».

З жонкай Інай.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (Продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении 14 августа 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условия продажи: 1. Претендент на покупку (Победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет Покупателя. **3.** Земельный участок под объект продажи **(лоты №№ 2, 3)** будет выделен согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). Возмещение затрат по выделению земельного участка под объект недвижимости возлагаются на Покупателя (Победителя аукционных торгов). **Примечание:** в соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %**			
Местонахождение лотов №№ 2, 3: Гомельская обл., Кормянский р-н, г. п. Корма, ул. Рогачевская, 21. И**нформация о земельном участке:** кадастровый номер **322555100001001373,** общей площадью **6,7272 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для размещения производственной базы			
1	**Капитальное строение с инв. № 330/С-19116**, общей площадью **745,4 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, наименование – **здание столярной мастерской (пилорама). Адрес:** Гомельская обл., Кормянский р-н, г. п. Корма, ул. Рогачевская, 21А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **322555100001001858,** общей площадью **0,4810 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания столярной мастерской (пилорамы). **В состав лота № 1 входят:** шкаф РУ-1 (инв. № 156), шкаф КТП-05-03 (инв. № 157), электрощит ЩО-7 (инв. № 171)	**16 079,00**	803,95	1 607,90
2	**Капитальное строение с инв. № 323/С-19249**, общей площадью **255,8 кв. м,** назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – **здание котельной** (инв. № 64). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19078**, общей площадью **0,00 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **дымовая труба № 16** (инв. № 16). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19077**, общей площадью **0,00 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **дымовая труба № 17** (инв. № 17). **В состав лота № 2 входят:** водоподготовка ВУ-3А-1 (инв. № 165), котлоагрегат Е1/9 (инв. № 164), фильтр хим. очистки воды ВПУ-3 (инв. № 172)	**9 485,00**	474,25	948,50
3	**Капитальное строение с инв. № 323/С-19036**, общей площадью **2 306,2 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административно-бытовое помещение с ремонтно-механическими мастерскими** (инв. № 26, 30, 63). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19246**, общей площадью **1 401,3 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, наименование – **здание склада** (инв. № 28, 29). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19115**, общей площадью **1 023,8 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, наименование – **здание материального склада** (инв. № 27). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19247**, общей площадью **14,0 кв. м,** назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – **здание насосной станции** (инв. № 79). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19075**, общей площадью **44,2 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **одноэтажное кирпичное нежилое здание сушилки** (инв. № 22). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19118**, общей площадью **42,3 кв. м,** назначение – здание специализированное энергетики, наименование – **здание трансформаторной подстанции** (инв. № 23). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19072**, общей площадью **0,00 кв. м,** назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – **проезды и площадки** (инв. № 80). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19073**, общей площадью **0,00 кв. м,** назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **эстакада № 4** (инв. № 4, 5). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19071**, общей площадью **2,3 кв. м,** назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – **одноэтажное нежилое здание деревянного туалета (уборной)** (инв. № 18). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19076**, общей площадью **0,00 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **молниезащита № 6** (инв. № 6). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19074**, общей площадью **0,00 кв. м,** назначение – сооружение специализированное связи, наименование – **радиовышка № 7** (инв. № 7). **Капитальное строение с инв. № 323/С-19114**, общей площадью **0,00 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **металлическая водонапорная башня** (инв. № 77). **Адрес:** Гомельская обл., Кормянский р-н, г. п. Корма, ул. Рогачевская, 21 и корпус № 12 (инв. № 80). **В состав лота № 3 входят:** забор опорная база (инв. № 74), сети водопровода из асбестоцементных труб ВТ-3 (инв. № 95), наружная канализация (инв. № 96), трансформатор силовой ТМ-250/10 (инв. № 150), трансформатор ОСМ-1 ТК-20 (инв. № 173,174,175), трансформатор ОСМ-1 Т-0,66 (инв. № 176), станок токарный 1К625 (инв. № 188), РУ10 кв ТП 364 (инв. № 723), кран-балка (инв. № 233), кран-балка (инв. № 231), циклон, инв. № 19	**273 917,50**	13 695,88	27 391,75
4	Электрощит ТДМ электрик (инв. № 169), ленточный станок MG6500 м3 (инв. № 839)	**2 462,00**	123,10	246,20
5	Станок многопильный ЦМ-150 (К) (инв. № 840)	**4 100,00**	205,00	410,00
6	Лесопильная рама р-63 (инв. № 371-1)	**2 100,00**	105,00	210,00

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001 в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 30 июля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга», в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 12 августа 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждения) по организации и проведению торгов, затрат на публикацию в газете «Звязда», затрат на публикацию извещения на сайте www.bankrot.gov.by, затрат по ранее несостоявшимся торгам в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Подробный список документов на участие размещен в газете «Звязда» от 30.03.2019 г. № 60 (28927). № 29 (29143).**

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ № 1: капитальное строение, инв. № 420/С-47034 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание механической мастерской), общей площадью 325,3 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/1, мехмастерская в районе д. Евсеевичи.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 423683200027000025, площадью 1,3546 га (назначение – для обслуживания здания механических мастерских), расположенном по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, в районе д. Евсеевичи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0314 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,1053 га.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 4 200 руб. (четыре тысячи двести рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 420 руб. (четыреста двадцать рублей)

ЛОТ № 2: капитальное строение, инв. № 420/С-47032 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание гаража), общей площадью 817,5 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/2, гараж в районе д. Евсеевичи.
Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 423683200027000026, площадью 1,1350 га (назначение – для обслуживания здания гаража), расположенном по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, в районе д. Евсеевичи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0485 га.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 18 120 руб. (восемнадцать тысяч сто двадцать рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1 812 руб. (одна тысяча восемьсот двенадцать рублей)

ЛОТ № 3: капитальное строение, инв. № 420/С-47276 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание птичника), общей площадью 1235,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 26Д.
Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый № 423650100025000003, площадью 0,6035 га (назначение – для обслуживания здания птичника), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 26Д. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0283.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 109 560 руб. (сто девять тысяч пятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 10 956 руб. (десять тысяч девятьсот пятьдесят шесть рублей)

ЛОТ № 4: капитальное строение, инв. № 420/С-47477 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 141,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 28А.
Лот № 4 расположен на земельном участке кадастровый № 423683200004000128, площадью 0,0310 га (назначение – для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 28А.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 130 800 руб. (сто тридцать тысяч восемьсот рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 13 080 руб. (тринадцать тысяч восемьдесят рублей)

ЛОТ № 5: капитальное строение, инв. № 420/С-47651 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание столярной мастерской), общей площадью 231,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, 16/2, столярная мастерская в районе д. Новицкие.
Лот № 5 расположен на земельном участке, кадастровый № 423683430055000138, площадью 1,2057 га (назначение – для обслуживания здания столярной мастерской), расположенном по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, 16/2, столярная мастерская в районе д. Новицкие. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема), площадью 1,2057 га; земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), площадью 1,2057 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0314 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадью 0,0303 га.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 19 920 руб. (девятнадцать тысяч девятьсот двадцать рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1 992 руб. (одна тысяча девятьсот девяносто два рубля)

Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

